штотыднёвая
грамадска-асветніцкая
газета

№ 1 (1597)

КУЛЬТУРА

7
студзеня
2023 г.

ЖЫЦЦЯДАЙНАЕ СВЯТЛО РАСТВА

Дарагія нашы адданыя падпісчыкі і сябры-чытачы!

Сёння, у светлы дзень Раства і ў дзень выхаду ў свет першага нумара-2023, мы звяртаемся да вас са словамі шчырай удзячнасці за ўвагу да нашых выданняў!

Вы падтрымалі падпіскай са знакам "плюс" газету "Культура" і часопіс "Мастацтва". Мы ўсё яскравей усведамляем: наша незалежная Беларусь, яе моцны народ ніколі, ні пры якіх сітуацыях не адрачэцца сваіх карэнных традыцый, свайго гонару за духоўныя каштоўнасці "залатога фонду" нацыянальнай культуры.

Віншуем вас з жыццядайным святам Раства і зычым адзінства і любові ў душах і сэрцах!

Мы — разам!

На тыдні

Гранты Прэзідэнта Беларусі прызначаны 50 спецыялістам, якія працуюць у сферы навукі, адукацыі, аховы здароўя, культуры, моладзевай палітыкі і ўнеслі значны ўклад у развіццё гэтых галін. Адпаведнае распараджэнне Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў напярэдадні Новага года.

Гранты выдзелены на правядзенне даследаванняў і распрацовак у вобласці матэрыялазнаўства, медыцынскіх, біялагічных, сельскагаспадарчых навук, на прымяненне сучасных методык, вучэбна-метадычных комплексаў, электронных навучальных дапаможнікаў. Выдатканыя сродкі і на стварэнне новых аб'ектаў музычнага, тэатральнага і іншых відаў мастацтва, экспазіцый музеяў, захаванне нацыянальных традыцый ткацтва. За кошт грантаў прадугледжана і выкананне праектаў, якія садзейнічаюць патрыятычнаму выхаванню, вывучэнню гістарычнай спадчыны, уключэнню ў грамадскую дзейнасць, павышэнню грамадзянскай актыўнасці моладзі.

Распараджэнне Прэзідэнта арыентавана на падтрымку і развіццё прыярытэтных для Беларусі сацыяльных сфер дзейнасці — навукі, адукацыі, аховы здароўя, культуры, моладзевых ініцыятыў.

■■■

З новага года змяніўся парадак падачы электронных зваротаў. Цяпер можна выкарыстаць дзяржаўную адзіную (інтэграваную) рэспубліканскую інфармацыйную сістэму ўліку і апрацоўкі зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб. Перавагай такога інструмента з'яўляецца зручнасць. Па сутнасці, заяўніку не патрэбна запаўняць спецыялізаваную форму на кожным інтэрнэт-сайце дзяржаўнага органа. Цяпер даступны адзіны інтэрфейс для афармлення і падачы электроннага звароту ў любую арганізацыю, падключаную да сістэмы.

■■■

Серыя навагодніх ранішнікаў стартавала ў Палацы Незалежнасці 4 студзеня. Маляўнічае прадстаўленне "Акадэмія часу" паглядзяць адораныя і таленавітыя школьнікі, хлопчыкі і дзяўчынкі са шматдзетных і няпоўных сем'яў, а таксама сацыяльна неабароненых катэгорый. Пабываюць на мерапрыемстве і дзеці з Данбаса, якія цяпер знаходзяцца ў нашай краіне. Кожнага маленькага госця чакае падарунак ад Прэзідэнта.

■■■

Дабрачынныя паказы навагодніх праграм адбыліся ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Там стала добрай традыцыяй падчас зімовых свят людзіць імпрэзы для хлопчыкаў і дзяўчынак з абмежаванымі магчымасцямі і дзяцей-сірот з Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей. Сёлета гасцей чакала інтэрактыўная праграма "Лясныя навагодніх прыгоды". Юныя наведвальнікі паспяхова выканалі заданні і баявую місію па выратаванні Дзеда Мароза і Снягуркі, пасля азнаёміліся з выставай савецкіх ёлачных цацак і атрымалі салодкія падарункі ад музея.

Год міру і стварэння адпавядае духу часу

Новы, 2023-і ў нашай краіне абвешчаны Годам міру і стварэння. Адпаведны Указ падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Мэта рашэння — кансалідацыя беларускага народа, умацаванне ў грамадстве ідэй міру і стваральнай працы як галоўных умоў развіцця дзяржавы.

Арыентацыя на дыялог і дыпламатычнае рашэнне гарачых пытанняў, на будаўніцтва, а не на разбурэнне ўжо стала своеасаблівай візітоўкай краіны. Беларусь неаднойчы даводзіла свету сваю канструктыўную пазіцыю і адданасць міру. Моц нашага народа заключаная ў адзінстве і жаданні жыць у згодзе. А працалюбства, мір і бяспека як умова свабоды, адкрытасць і гасціннасць не пустыя ярлыкі, а каштоўнасныя прыярытэты беларусаў, якія фіксуюць навукоўцы-сацыёлагі.

Мы ўмеем браць урокі з мінулага, таму шануем спакой і чыстае неба. Год міру і стварэння мусіць чарговы раз паказаць адданасць беларусаў гэтым каштоўнасцям.

У навагоднім звароце Прэзідэнт падкрэсліў, што абвяшчэнне Года міру і стварэння адпавядае духу часу і памкненням нашых сэрцаў. "Ведаю, больш за ўсё вы хочаце пачуць, што будзе далей. Ці застанецца Беларусь астраўком бяспекі? Упэўнены, што гэтае пытанне стане і галоўным жаданнем, якое вы загадаеце апоўначы. Адказ просты: усё ў нашым жыцці будзе залежаць ад кожнага з нас. І ад усіх нас разам", — сказаў Кіраўнік дзяржавы.

Таксама Аляксандр Лукашэнка зазначыў, што дзеля жыцця ў міры і бяспецы мы павінны паважаць і цаніць працу людзей у пагонах, выхоўваць дзяцей патрыётамі сваёй краіны і выконваць закон, працаваць многа і добрасумленна, а каб жыць у свабодным і незалежным дзяржаве — берагчы і абараняць гістарычную памяць, духоўныя каштоўнасці і спрадвечныя традыцыі.

Менавіта таму ключавымі напрамкамі ў новым годзе будуць удасканаленне сістэмы ваенна-патрыятычнага выхавання насельніцтва, прасоўванне мірных ініцыятыў грамадзян і грамадскасці, садзейнічанне міжканфесійнаму дыялогу, які забяспечвае мір і згоду ў беларускім грамадстве, дэманстрацыя пераваг беларускай эканамічнай мадэлі ва ўмовах глабальнай турбулентнасці, пазіцыянаванне стваральнай працы як галоўнай умовы развіцця беларускай дзяржавы.

Такая тэматыка дазволіць умацаваць успрыманне Беларусі як астраўка міру, неаспрэчная каштоўнасць якога для насельніцтва краіны з'яўляецца важкім аргументам у дасягненні згоды ў іншых найважнейшых пытаннях грамадскага жыцця. Беларускім адказам на мілітарызацыю ў еўрапейскім рэгіёне стане мірная стваральная праца суайчыннікаў.

Ураду даручана з удзелам аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама распрацаваць і зацвердзіць рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні Года міру і стварэння.

Вызначаны прыярытэты

Чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства адбылася 3 студзеня. Дзякуючы сродкам відэасувязі, у пасяджэнні паўдзельнічалі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

Міністр звярнуў увагу на патрэбу ў пільным падыходзе да кадравай палітыкі, якую належыць праводзіць на новым узроўні, бо менавіта гэта з'яўляецца асновай усёй далейшай дзейнасці ў сферы культуры. Як у міністэрстве, так і на месцах належыць актывізаваць фарміраванне кадравага рэзерву і стварэнне кадравага рэестра.

Яшчэ абмяркоўвалася выкананне паказчыкаў па экспарце паслуг, асабліва навучальнымі ўстановамі сферы культуры. Кіраўніцтву гэтых арганізацый пастаўленая задача прыцягваць замежных студэнтаў з новых краін, у тым ліку з Кітайскай Народнай Рэспублікі, Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі, Пакістана, Таджыкістана і Узбекістана. Наладжваецца супрацоўніцтва ўстаноў адукацыі сферы культуры з пасольствамі названых дзяржаў.

Акрамя таго, Анатолій Маркевіч падкрэсліў, што неабходна актывізаваць работу па ўключэнні чарговых элементаў матэрыяльнай і нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі ў спісы UNESCO. Па словах міністра, таксама варта зрабіць акцэнт на вяртанні беларускіх гісторыка-культурных каштоўнасцей з-за мяжы.

Саццаследаванне: 69,4 % беларусаў лічаць мінулы год удалым.

З Указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 452 і № 453 ад 30 снежня 2022 г. аб прысуджэнні прэміі "За духоўнае адраджэнне" і спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

За актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, што садзейнічае захаванню і памнажэнню нацыянальнага культурнага здабытку, выхаванню ў моладзі любові да Айчыны, умацаванню духоўных каштоўнасцей і ідэй міласэрнасці, прысудзіць прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне" 2022 года:

аўтарскаму калектыву ў складзе **Баранчука Васіля Анатольевіча**, дырэктара Духоўна-асветніцкага цэнтра прыхода храма ў гонар прападобнамучаніцы вялікай княгіні Елісаветы ў г. Бабруйску, протаіерэя **Толаха Віктара Уладзіміравіча**, настаяцеля прыхода храма ў гонар прападобнамучаніцы вялікай княгіні Елісаветы ў г. Бабруйску, — за вялікі ўклад ва ўмацаванне духоўных каштоўнасцей, культурнае і маральнае выхаванне дзяцей і моладзі;

ваенна-патрыятычнаму клубу "Рысь" вайсковай часці 3214 унутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў — за актыўную дзейнасць па ваенна-патрыятычным выхаванні падлеткаў;

калектыву дзяржаўнай навуковай установы "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" — за значны ўклад у выхаванне любові да Айчыны, даследаванні гісторыка-культурнай спадчыны, выпуск навуковага энцыклапедычнага выдання "Гарады і вёскі Беларусі";

рэспубліканскаму грамадскаму аб'яднанню "Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа" — за актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, значны ўклад у аказанне дабрачыннай дапамогі і развіццё валанцёрскага руху.

За выдатныя дасягненні ў галіне музычнага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, музейнай справы, народнай і аматарскай мастацкай творчасці, навучанне і выхаванне творчай моладзі, якія атрымалі грамадскае прызнанне, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2022 года:

аўтарскаму калектыву ў складзе **Барысевіч Яніны Анатольеўны**, загадчыка аддзела традыцыйнай мастацкай культуры дзяржаўнай установы культуры "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці", **Мазепа Наталіі Аляксандраўны**, намесніка дырэктара дзяржаўнай установы "Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры", **Егіазарана Георгія Анушаванавіча**, старшыні Кансультатыўнага міжэтнічнага савета пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцей, старшыні грамадскага аб'яднання "Мінскае гарадское армянскае культурна-асветніцкае таварыства «Айастан»", — за ўклад ва ўмацаванне нацыянальнай згоды ў беларускім грамадстве, правядзенне Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур;

грамадскаму аб'яднанню "Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя" — за ўклад у грамадзянска-патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення, рэалізацыю сацыяльна значных дзіцячых праектаў і ініцыятыў;

дзяржаўнай установе "Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Узорна-паказальны аркестр Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь»" — за значныя дасягненні ў галіне музычнага мастацтва, актыўны ўдзел у грамадска-культурным жыцці краіны;

калектыву дзяржаўнай гісторыка-культурнай установы "Гомельскі палацава-паркавы ансамбль" — за вялікі ўклад у развіццё музейнай справы, рэалізацыю выставачных праектаў па захаванні гістарычнай памяці беларускага народа;

калектыву дзяржаўнай установы культуры "Дрыбінскі раённы гісторыка-этнаграфічны музей" — за вялікі ўклад у развіццё народнай мастацкай творчасці, адраджэнне традыцый шапавальства;

калектыву дзяржаўнай установы культуры "Цэнтр народнай творчасці і рамёстваў у г. п. Копысь Аршанскага раёна" — за актыўную дзейнасць па захаванні тэхналогій стварэння вырабаў традыцыйнай керамікі Аршанскага раёна;

калектыву ўстановы адукацыі "Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства" Міністэрства адукацыі — за выдатныя дасягненні ў выхаванні моладзі, рэалізацыю культурна-турыстычных праектаў;

народнаму фальклорнаму калектыву "Таняжанка" філіяла "Тонежскі сельскі дом культуры" дзяржаўнай установы "Лельчыцкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці" — за значныя дасягненні ў захаванні музычнай спадчыны, звычаяў і традыцый Палескага рэгіёна;

творчай майстэрні эстраднага мастацтва "Хвілінка" грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз музычных дзеячаў" — за высокае прафесійнае майстэрства, актыўны ўдзел у грамадска-культурных праектах патрыятычнай тэматыкі;

установе Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Выдавецкі дом «Беларусь сегодня»", дзяржаўнай установе "Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь" — за значную работу па фарміраванні грамадскай свядомасці, папулярызацыю гісторыі партызанскага і падпольнага руху Беларусі.

Ад усёй душы!

У новы год — з новымі традыцыямі. У Беларусі ўпершыню стартавала рэспубліканская дабрачынная акцыя "Ад усёй душы". Ідэю атуліць цяплом падчас зімовых свят людзей сталага ўзросту прапанаваў Кіраўнік дзяржавы на галоўнай ёлцы краіны.

Звяртаючыся да хлопчыкаў і дзяўчынак, якія з'ехаліся ў Палац Рэспублікі на дабрачынныя мерапрыемства "Нашы дзеці", Аляксандр Лукашэнка заўважыў: "Хацелася б, каб акцыя, калі ідзём з падарункамі да вас, працягнулася... І мы прыйшлі да нашых старых і падарылі ім падарункі, павіншаваўшы з Новым годам і Нараджэннем Хрыстовым".

Ініцыятыва беларускага лідара адразу знайшла водгук у грамадстве — па ўсёй краіне віншуюць адзінокіх састарэлых, людзей з інваліднасцю, тых, хто жыве ў дамах-інтэрнатах, знаходзіцца ў бальніцах. У акцыі ўдзельнічаюць прадстаўнікі дзяржаўных і мясцовых органаў улады, дэпутаты, кіраўнікі прадпрыемстваў. Прафсаюзныя арганізацыі імкнуцца паклапаціцца пра тых, хто шмат гадоў працаваў на вытворчасці. Справа актывізтаў БРСМ і піянераў — уборка снегу, нарыхтоўка дроў, дастаўка прадуктаў і лекаў ветэранам. Сустрэчы старэйшага і маладога пакаленняў праходзяць у фармаце чаявання, круглых сталоў, таксама ладзяцца канцэрты, тэатралізаваныя паказы ды іншыя святочныя праграмы. Асабліва акцэнт — на доўгажыхарах, якія ў перыяд акцыі адзначаюць юбілей.

Акцыю падтрымалі ў Нясвіжскім раёне

У Беларусі больш за 120 тысяч адзінокіх пажылых грамадзян. Яшчэ каля 20 тысяч знаходзяцца ў дамах-інтэрнатах. Увагай не абмінуць нікога! Бо сярод мэт праекта — максімальна далучыць школьнікаў і студэнтаў да аказання дапамогі састарэлым, развіваць дыялог пакаленняў "Ад дзяцей — пажылым людзям".

Акцыя працягнецца да 14 студзеня і зойме годнае месца ў спісе пастаянных навагодніх дабрачынных традыцый.

Надвор'е — не перашкода!

Як беларусы сустрэлі 2023-і?

Салаты і феерверкі ў нашым успрыманні неаддзельныя ад зімовых свят, але што наконт больш асабістых традыцый? Сябры "Культуры" расказалі, як звычайна бавяць самы дзівосны час года.

ІГАР АРТАМОНАЎ,
народны артыст Беларусі, старшы рэпетытар па балеце Вялікага тэатра Беларусі:

— Лічу, што самае галоўнае — сустрэць свята разам з сям'ёй. Тым больш што я нарадзіўся 31 снежня. Але заўсёды згадваю і іншую традыцыю... Раней у апошні дзень года наш калектыў ставіў "Шчаўкунка", як памятаю, роўна ў гадзіну. Самы малады артыст, я выступаў на сцэне замест сталых калег, яны рабілі перадышку. Такім чынам, кожны Новы год быў для мяне адначасова хвалюючай і прыемнай падзеяй. Сёння ўспамінаю мінулае з усмешкай — столькі часу прайшло, а я ўсё гэтак жа, з радасцю і нецярпеннем, чакаю зімовых свят.



ДАР'Я МАРЦІНКЕВІЧ,
загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Лідскай раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы:

— У Новы год у нашай сям'і пануе асаблівая атмасфера любові, разумення, душэўнага цяпла. І справа зусім не ў педантычна падабраных сувенірах, застоллі з кулінарнымі шэдэўрамі... Галоўнае, што мы знаходзімся ў коле самых блізкіх людзей, якія дораць пазітыўныя эмоцыі. А калі гаварыць аб працоўным калектыве, наш аддзел заўсёды рыхтуецца да зімовых свят. Імкнёмся стварыць на рабочым месцы чароўную атмасферу цеплыні і ўтульнасці. Абмен падарункамі з калегамі — таксама прыемны навагодні звычай.

КРЫСЦІНА БАШАРЫМАВА,
вядучы рэдактар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы:

— У мяне Новы год прайшоў, мусіць, як у кожнай сям'і: гатаванне страў, вечарына за вялікім сталом, бой курантаў і "Блакітны агеньчык"... Праца часткова паўплывала на ўспрыманне шматлікіх свят: пачала ставіцца да іх больш свядома. Напрыклад, раней не была ў курсе, што беларускага Дзеда Мароза завуць Зюзя і што той ездзіў не на аленях, а на конях. Стараюся больш дазнацца пра нашы спрадвечныя традыцыі, каб адпавядаць ім.

ДАР'Я КАЛАСОЎСКАЯ,
харэограф студыі танца і фітнесу Zames:

— Мой галоўны звычай — сустракаць Новы год, менавіта поўнач, з сям'ёй. Магу з'ехаць да сяброў ці адлучыцца па важных справах, але бой курантаў заўсёды слухаю побач з блізкімі. Таксама люблю ўсе падарункі заварочваць уласнаруч. Няхай часам гэта выглядае нязграбна, затое відаць, што я ўклала душу. Ёсць традыцыя і на працы — закрываць год цікавай падзеяй: новым танцам ці міні-праектам. Да таго ж імкнуся падчас зімовых свят дапамагчы незнаёмым людзям. Нават зрабіўшы нешта нязначнае, ты падорыш усмешку ці нагадаеш чалавеку, што цуды здараюцца.

Дзям'ян КУЛІКОВІЧ

Па меркаванні 61 % рэспандэнтаў 2023 год будзе лепшым за 2022-і.

Цвярдыня ў летапісе краю

Асаблівым 2023-і абяцае стаць для жыхароў Слуцка. Старажытны горад абвешчаны культурнай сталіцай года. "К" расказвае, чым славіцца гэты край і якімі падзеямі там адзначаць атрыманне ганаровага статусу.

Адразу зазначым, што здзіўляць случчане пачалі яшчэ да таго, як горад пераняў эстафету рэспубліканскай акцыі ад Оршы. У ліпені мясцовыя краязнаўцы "састарылі" свой населены пункт на 111 гадоў! Ім удалося ўстанавіць, што ўпершыню паселішча ўпамінаецца ў 1005-м у рукапісным кнізе "Патэрык пячэрскі". Раней жа пунктам адліку быў запіс у "Аповесці мінулых гадоў": у летапісным зборы пад 1116 годам згадваецца барацьба вялікага князя кіеўскага Уладзіміра Манамаха з мінскім князем Глебам Усяславічам, які "ваяваў з дрыгавічамі і Слуцк спаліў, і не каяўся ў гэтым і не выказваў пакорнасці..."

Факт каштоўны для разумення не столькі мінуўшчыны, колькі сучаснага стану культурнай галіны Слуцка. Такая пільнасць да летапісу чарговы раз засведчыла: у горадзе беражліва ставяцца да гісторыі і традыцый ды гадуюць на гэтай глебе новыя праекты.

НЯСКОНЧАНАЯ П'ЕСА

У сярэдзіне XVIII стагоддзя з ініцыятывы князя Гераніма Фларыяна Радзівіла ў Слуцку заснаваны прафесійны тэатр — адзін з першых на беларускіх землях. Пэўны час пры ім дзейнічала балетная школа і тэатр марыянетак, а паказы суправаджаў прыдворны аркестр з замежных і мясцовых музыкантаў. Пасля смерці князя новы ўладальнік горада Міхаіл Казімір Радзівіл скасаваў трупу і перавёў акцёраў у Нясвіж.

Сёння ў Слуцку зноў віруе тэатральнае жыццё. Ажно чатыры калектывы гэтага кірунку — для дзяцей і дарослых — працуюць у гарадскім Доме культуры. Адраджэнне традыцый пачалося ў савецкі час з невялікага драматычнага гуртка на чале з мясцовым жыхаром Міхаілам Бортнікам. Калектыў вырас да Народнага тэатра драмы і камедыі імя Уладзіслава Галубка, які аб'ядноўвае людзей розных прафесій і ўзросту. Рэпертуар калектыву багаты — больш за трыццаць пастановак па п'есах класікаў беларускай і замежнай драматургіі. У лістападзе спектакль "Пінская шляхта, або Брутальная гісторыя" слуцкага тэатра быў адзначаны дыпломам II ступені і чатырма адмысловымі ўзнагародамі на абласным фестывалі "Бярэзінская рампа".

ЦВЯТОК РАДЗІМЫ НА ПЕРСІДСКІ ЛАД

Пра Слуцкія паясы ў Беларусі ведаюць нават першакласнікі, а вось з сакрэтамі вытворчасці гэтых аксесуараў знаёмы рэдкі дарослы, дый не кожны бачыў славутыя тканіны на свае вочы. Дык навошта пазбаўляць сябе такой магчымасці — запрашае музей гісторыі слуцкіх паясоў! Экспазіцыя разгарнулася на прадпрыемстве, дзе сёння ствараюць копіі ўпрыгажэнняў з захаваннем традыцый, з выкарыстаннем натуральнага шоўку і металізаваных нітак. У музеі можна ўбачыць арыгінал і паўтор пояса, а таксама даведацца пра гісторыю слуцкай мануфактуры, жыццё прадстаўнікоў роду Радзівілаў і звычайных сялян. Акрамя таго, Слуцкім паясам прысвечаны цэлы раздзел мясцовага краязнаўчага музея. Дзякуючы дабрачыннаму збору сродкаў установа змагла набыць у прыватнага калекцыянера арыгінальную рэліквію.

На свяце рамёстваў "Слуцкія паясы"

МЯСЦОВАЯ СКАРБНІЦА

Слуцкі пояс па праве лічыцца перлінай калекцыі краязнаўчага музея, але не толькі гэтым узорам дэкаратыўнага мастацтва можа ўразіць сховішча. Пасля нядаўняга капітальнага рамонту і абнаўлення экспазіцыі наведвальнікам таксама даступныя залы "Ад перабытнаабшчыннага ладу да Слуцкага княства" і "Слуцкае княства". Сярод іншага там дэманструюцца матэрыялы археалагічных раскопак на гарадзішчы, партрэты князёў Алельковічаў, выкананыя Міхаілам Басалыгам, факсімільнае выданне Слуцкага Евангелля — помніка славянскага пісьменства XVI стагоддзя — і макет драўлянай крэпасці. І сам будынак музея стаў славутасцю горада. Былы дом дваранскага сходу ўзведзены ў канцы XVIII стагоддзя як сядзібны. Сёння ён унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей і мае статус помніка рэспубліканскага значэння.

Абноўленая экспазіцыя краязнаўчага музея

Случанская калядная зорка — прэтэндэнт на статус нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці Беларусі



Кафедральны сабор Архангела Міхаіла

РАМЕСНАЕ СКРЫЖАВАННЕ

Ткачыхі з Капыля і Старых Дарог, ганчары з Лагойска ды Івянца, разьбяры з Вілейкі і Мядзела — майстроў усёй Міншчыны і іншых рэгіёнаў раз на два гады збіраюцца ў Слуцку на фестываль-конкурс узорных і народных калектываў "Слуцкія карункі". Адбудуцца адкрыты фестываль навучэнцаў дзіцячых школ мастацтваў "Калядныя сустрэчы", адмысловы праект "Тэатральныя скрыжаванні" з удзелам самадзейных калектываў краіны. Горад стане пляцоўкай для правядзення абласнога свята рамёстваў "Слуцкія паясы", адкрытага фестывалю духавой музыкі "Майскі вальс", фіналу нацыянальнага адбору фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску".

Інтэнсіўнай будзе гастрольная дзейнасць. Мы чакаем у госці Ірыну Дарафееву, Віктэрыю Алешка, Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь, ансамбль "Сябры", арт-гурт "Беларусы", іншых зорак беларускай і расійскай эстрады. Творчыя калектывы раёна са званнямі "народны" і "ўзорны" парадуюць случчан серыяй канцэртаў, паўдзельнічаюць у святах мікраёнаў, фестывалі дзіцячай творчасці "Таленты дабрыні", канцэртах і тэатралізаваных прадстаўленнях да галоўных дзяржаўных свят.

Для юнакоў і дзяўчат пастараемся напоўніць год яркімі і відовішчнымі падзеямі пад лозунгам "У аб'ектыве моладзь": напрыклад, раённы конкурс "Творчасць. Талент. Поспех" з удзелам аматарскіх калектываў устаноў культуры і фестываль альтэрнатыўнай культуры "Life Energy". Для прадстаўнікоў старэйшага пакалення пройдуць конкурсныя праграмы "Супердзядуля" і "Шчасце быць разам", а таксама творчы марафон вясковай культуры "Няма смачней вадзіцы, як з роднай крыніцы".

Асаблівую ўвагу нададзім мерапрыемствам да юбілеяў выбітных асоб – да 110-годдзя пісьменніка Антона Алешкі, 105-годдзя кандыдата ваенных навук, лаўрэата Ленінскай прэміі Канстанціна Герчыка, да 120-годдзя савецкага канструктара, спецыяліста ў галіне авіяцыйных і ракетных тэхналогій Сямёна Косберга.

Напярэдадні — тры свечкі, іх мігценне дадае таямнічасці дзеі. А ўпрыгожаныя рознакаляровай фольгай промні круцяцца вакол цэнтральнай часткі. Канструкцыя на доўгім драўляным шасце цяжкая, таму хадзілі з ёй гурты фізічна моцных мужчын, якія да таго добра спявалі.

Сяляне ж гасілі святло і праз вокны назіралі, як зіхацела зорка, і слухалі, як мужчынскія галасы вялі песню аб нараджэнні Хрыста.

Старадаўнюю зорку захавала і перадала нашчадкам Ефрасіння Шахновіч, а яе сын Павел навучыў іншых жыхароў Лучнікаў выраблядь атрыбут і спяваць калядкі. Цяпер культработнікі працуюць над наданнем аб'екту "Тэхналогія вырабу Случанскай каляднай зоркі" статусу нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці Беларусі.

АПІРЫШЧА ДУХОЎНАСЦІ

Слуцк лічыцца старадаўнім духоўным цэнтрам. Археалагічныя раскопкі выявілі існаванне ў гэтым месцы храма, складзенага з плінфы, у сярэдзіне XII стагоддзя. Ёсць вестка і пра Слуцкі Псалтыр XI стагоддзя, аднак тэкст не знойдзены.

Адзін з апошніх князёў роду Алельковічаў Юрый уласнаруч перапісаў Евангелле і падарыў яго Свята-Траецкаму манастыру, а яго дачку Сафію шануюць як святую за адданасць праваслаўнай веры.

А некалі ў горадзе існавалі ажно 13 цэркваў і тры манастыры, аднак да нашых дзён дайшла адна старадаўняя святыня — кафедральны сабор Архангела Міхаіла. Помнік драўлянага народнага дойлідства XVIII стагоддзя з элементамі барока ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Пазалетась мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веньямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі асвяціў храм пасля рэканструкцыі.

Даніл ШЭЙКА

Старшыня Слуцкага райвыканкама Уладзімір Года:

– Спакон вякоў наш горад славіцца багатымі культурнымі традыцыямі, працавітымі і мудрымі людзьмі, якія зрабілі важкі ўнёсак у беларускую і сусветную скарбніцу. Сучасная Случчына дынамічна развіваецца, пры гэтым мясцовыя жыхары зберагаюць традыцыі продкаў, захоўваюць памяць пра папярэднікаў. У рэалізацыі культурнай палітыкі ўдзельнічаюць 66 устаноў, у тым ліку клубнага тыпу, бібліятэкі, дзіцячыя школы мастацтваў, краязнаўчы музей і яго філіялы – галерэя мастацтваў і музей этнаграфіі.

Праграма мерапрыемстваў у рамках рэспубліканскай акцыі "Культурная сталіца года" будзе спрыяць прэзентацыі самабытнасці горада, павышэнню яго турыстычнай прывабнасці, развіццю і папулярызацыі дасягненняў нацыянальнай культуры, далучэнню да іх шырокіх слаёў насельніцтва, абмену духоўнымі каштоўнасцямі, актывізацыі творчых ініцыятыў.

Усе ўстановы культуры актывізаваліся, працуюць на ўздыме і з цікавасцю. На гэты год запланаваны канцэрты вядучых творчых калектываў і выканаўцаў, спектаклі, часовыя экспазіцыі вядомых мастакоў, сустрэчы з пісьменнікамі і паэтамі. Адзначу персанальную выставу заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Уладзіміра Пракапцова да 70-годдзя творцы, выставу работ Ігара і Алены Бархатковых. Майстроў слова на Случчыне збяруць XVI Віткаўскія чытанні, прысвечаныя пісьменніку-земляку Васілю Вітку. Дарэчы, падчас форуму плануем урачыстае адкрыццё сквера ў гонар знакамітага літаратара.

Сёлета ў нашым горадзе ўпершыню пройдзе адкрыты

Абраз XVIII стагоддзя з Віцебшчыны

Беларуская батлейка "Віцебскі жлоб"



Праз традыцыі — да веры

Як беларусы адзначалі Раство раней і як цяпер?

Праваслаўная царква лічыць нараджэнне Ісуса Хрыста найвялікшай падзеяй у гісторыі чалавецтва. У перыяд падрыхтоўкі да свята, нягледзячы на тое, што пост яшчэ працягваецца, у храмах пачынаюць усё часцей гучаць вясёлыя спевы, зяяюць упрыгожаныя ялінкі. Вернікі напярэдадні Раства імкнуцца прайсці таінствы споведзі і прычасця, каб быць гатовымі да свята не толькі целам, але і духам. У Доме прэсы 3 студзеня адбылася прэс-канферэнцыя, прысвечаная традыцыям святкавання праваслаўнымі дня Хрыстовага нараджэння ў Беларусі, у якой узялі ўдзел прадстаўнікі духавенства і супрацоўнікі Міністэрства культуры.

ДА ПЕРШАЙ ЗОРКІ

Старшыня Сінадальнага аддзела Беларускай Праваслаўнай Царквы па царкоўным мастацтве, архітэктуры і рэстаўрацыі протаіерэй **Ігар Карасталёў** падкрэсліў, што традыцыі адзначэння Раства фактычна застаюцца нязменнымі цягам стагоддзяў. Ён прыгадаў, як пачынаў служыць яшчэ ў савецкія часы, калі ў Мінску дзейнічалі толькі два праваслаўныя храмы: кафедральны сабор Сашэсця Святога Духа і царква Святога Аляксандра Неўскага. Святароў тады было вельмі мала, але на Раство ўсе яны збіраліся разам.

Трапезу рыхтавалі матушкі — жонкі святароў. У заключны і самы строгі момант посту, у пярэдадзень Раства, гатавалі кушчу — рысавую кашу з мёдам, кампот з сухафрукталў. Лічыцца, што на стале мусяць быць дванаццаць посных страў, а прымаць ежу ў гэты дзень можна толькі пасля з'яўлення на небе першай зоркі, што сімвалізуе Віфлеемскую зорку, якая, паводле Евангелля, абвясціла свету аб нараджэнні Збаўцы. А вось пасля заканчэння святочнай літургіі ўжо можна есці і мясныя стравы.

ДА ЧАГО ТУТ ПАВУК?

Начальнік аддзела арганізацыі аховы і ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцей Міністэрства культуры **Марыя Нецвятаева** нагадала, што з Раством звязаныя і беларускія традыцыі саломапляцення, якія ў снежні мінулага года былі ўключаныя ў Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны UNESCO. Некаторыя з іх дапамагалі нашым продкам па-свойму асэнсоўваць біблейскія рэаліі, тлумачыць іх праз блізкія і знаёмыя з побыту з'явы.

Так, на Раство было прынята ўпрыгожваць хату, між іншага, саламянымі павукамі — у народнай свядомасці яны нагадвалі пра падзеі, якія адбываліся перад нараджэннем Хрыста, калі, паводле Евангелля, цар Ірад загадаў знішчыць у Віфлееме ўсіх нованароджаных немаўлят, каб не дапусціць з'яўлення Збаўцы. Паводле беларускага падання, у гэты момант святая праведная Лізавета са сваім сынам Іаанам, які пазней будзе вядомы як Хрысціцель і Прадвеснік Хрыста, ратавалася ад рымскіх воінаў Ірада ў пячоры, дзе павукі сплялі павуцінне, каб схаваць за ім маці і дзіця ад забойцаў.

ПРЭЧ ЗАБАБОНЫ

Настаяцель храма святога Архангела Міхаіла ў Жодзіна протаіерэй **Андрэй Еўдакімаў** падкрэсліў, што народныя традыцыі, звязаныя са святкаваннем Раства, дапамагаюць людзям успрыняць сутнасць евангельскіх падзей, зразумець само значэнне гэтага свята. Ён адзначыў, што ў яго прыходзе ёсць традыцыя наведваць прадпрыемствы горада, прапаведуючы аб значэнні Раства, тлумачачы яго сэнс даступнымі для ўсіх сродкамі. Дзяцей тут імкнуцца прывучыць не толькі чакаць святочных падарункаў, але і самім задумвацца, што яны могуць падарыць сваім бліжнім, асабліва тым, якія знаходзяцца ў патрэбе.

Таксама айцец Андрэй прыгадаў пра старадаўні беларускі звычай, які збяргося і ў яго сям'і, — на Раство засцілаць святочны стол сенам, што нагадвае аб хляве, дзе нарадзіўся Хрыстос. Разам з тым святар перасцерагае вернікаў ад следавання традыцыям, якія не адпавядаюць хрысціянскаму веравучэнню і светапогляду, — напрыклад, такім, як варажба. Царква лічыць, што ведаць будучыню дадзена толькі Богу, а імкнуцца ўпадобніцца яму ў гэтым — грэх. Важна таксама правільна разумець сутнасць посту, якая палягае не толькі і не столькі ў адмове ад мясных страў, як ва ўстрыманні ад кепскіх учынкаў і думак, у духоўнай падрыхтоўцы да свята.

ДАПАМОГА АБЯЗДОЛЕНЫМ

Старшыня Цэнтра падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля» **Веранічка Сярдзюк** прыгадала аб такіх характэрных беларускіх традыцыях, прымеркаваных да Раства, як батлеечныя прадстаўленні, якія распавядаюць з дапамогай лялек гісторыю нараджэння Хрыста, а таксама калядаванне, калі апранутыя ў адмысловыя касцюмы людзі ходзяць па хатах і спяваюць святочныя песні, атрымліваючы за гэта пачастункі. Сёння амаль у кожным прыходзе на Раство ладзяцца канцэрты, дабрачынныя акцыі, выставы — варта толькі пацікавіцца ў мясцовым храме, калі запланаваныя такія мерапрыемствы.

Да Раства імкнуцца прымеркаваць і дабрачынныя акцыі, звязаныя з дапамогай людзям у патрэбе, бежанцам і іншым неабароненым групам. Нездарма тут прасочваецца сувязь з евангельскай гісторыяй, бо сям'я нованароджанага Ісуса таксама цярпела пераслед і вымушаная была ўцякаць з родных мясцін. Распаўсюджаная ў нас і традыцыя міжканфесійнага святкавання, калі прадстаўнікі розных канфесій, якія ў Беларусі адзначаюць Раство паводле розных календароў, ходзяць адно да аднаго ў госці з віншаваннямі. Таксама добры святочны звычай — талака, то-бок праца на карысць іншым, а не сабе. Нягледзячы на агульнавядомую забарону працаваць у святы, менавіта такая праца лічыцца цалкам дапушчальнай.

ЗАХАВАЛЬНІКІ ТРАДЫЦЫЙ

Кансультант упраўлення прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры **Людміла Манакова** распавяла аб больш сучаснай традыцыі, якая была запачаткаваная ў нашай краіне ў 1996 годзе, — уручэнні прэмій Кіраўніка дзяржавы "За духоўнае адраджэнне" і спецпрэмій дзеячам культуры і мастацтваў. Сярод сёлетніх лаўрэатаў прэміі "За духоўнае адраджэнне" — протаіерэй Віктар Толах і дырэктар Духоўна-асветніцкага цэнтра прыходу храма ў гонар святой вялікапакутніцы вялікай княгіні Лізаветы Васіль Баранчук, Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук, а таксама вайскова-патрыятычны клуб "Рысь".

Прэміямі дзеячам культуры і мастацтваў былі ўдастоеныя ўзорна-паказальны аркестр Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, творчая майстэрня эстраднага мастацтва "Хвілінка", калектывы Цэнтра народнай творчасці і рамёстваў у гарадскім пасёлку Копысь і Дрыбінскага раённага гісторыка-этнаграфічнага музея, а таксама народны фальклорны калектыў "Таняжанка". Урачыстая цырымонія ўручэння прэмій пройдзе 10 студзеня ў Палацы Рэспублікі, таксама тут будзе прадстаўленая выстава дасягненняў лаўрэатаў і адбудзецца канцэрт "Мастацтва як сэнс жыцця".

Антон РУДАК

Утаймаваць фартуну,

або "Заслужаны" — заслужана!

Калі прасачыць гісторыі поспеху знакамітасцей, то выявіцца заканамернасць: шлях да зорнага статусу праходзіць праз пераадоленне цяжкасцей. І гэтае правіла працуе на ўсіх узроўнях. Камерны жаночы хор Гродзенскага музычнага каледжа нядаўна пацвердзіў званне заслужанага аматарскага калектыву. У чым, спытаеце, складанасць? У тым, што за два месяцы трэба было абнавіць праграму на 70 %. На змену ранейшаму кіраўніку — заслужанаму дзеячу культуры Рэспублікі Беларусь Ларысе Іконнікавай, якая займала гэтую пасаду 40 гадоў, — прыйшоў малады спецыяліст. Пра сакрэты фартуны і правілы тымбілдынгу мы пагаварылі з новым кіраўніком хору Марынай Шарэйка.

ВУЧЫЦЦА — ВУЧЫЦЬ

Як дзеці трапляюць у музычную школу? Часцяком да першакласнікаў завітваюць педагогі з розных калектываў, агітуючы заняцца спевамі ці ігрой на музычным інструменце. Так здарылася і са спадарыняй Марынай. Да яе ў клас зазірнула настаўніца, запрасіла ў гурток "Вясёлыя ноткі", а заўважыўшы здольнасці дзяўчынкі, парэкамендавала рухацца далей. Наша гераіня паступіла ў музычную школу на спецыяльнасць "Харавое дырыжыраванне" і зразумела, што знайшла справу жыцця.

Марына адвучылася ў Гродзенскім дзяржаўным музычным каледжы, пасля ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі — 16 гадоў спецыялізаванай адукацыі недапушчальна хаваць ад свету. Хормайстру хацелася дзяліцца ведамі.

— Я марыла быць выкладчыкам. Аб тым, как пачаць выканальніцкую дзейнасць, нават думаць не жадала, — расказвае музыкант.

Лёс склаўся так, што Марына Шарэйка патрапіла ў родны каледж, дзе дагэтуль працуюць яе настаўнікі. Стаць калегамі з тымі, хто не так даўно цябе вучыў, — выпрабаванне не з простых.

— Прызначэнне змусіла пахвалявацца. Гэта сапраўдны экзамен перад маімі педагогамі. Як я праяўлю сябе на пасадзе кіраўніка? Спраўлюся? — згадвае гераіня.

ЯШЧЭ 26 ДЗЯЦЕЙ!

Кіраўнік хору павінен валодаць вялікай колькасцю прафесійных кампетэнцый: бездакорна разбірацца ў тэорыі ды тэхніцы спеваў, асаблівасцях фарміравання голасу, ведаць розныя вакальныя прыёмы... Яшчэ такі спецыяліст абавязаны знаходзіць агульную мову з апекаванцамі. Без узаемаразумення і павагі калектыў не зможа працаваць зладжана.

— Я вельмі люблю сваіх вуканіц і бачу, што яны адказваюць мне. Мы разам вырашаем велізарны спектр пытанняў, пачынаючы ад знешняга выгляду і заканчваючы перажываннямі дзяўчат як у прафесійным, так і ў асабістым плане, — распавядае Марына Уладзіміраўна.

Для студэнтаў наша гераіня стала не проста педагогам, але і выхавальнікам.

— У мяне з'явілася 26 дзяцей у дадатак да маіх уласных! — смяецца яна.

Вучаніцы паважаюць свайго выкладчыка. Усведамляюць, якая гэта ўдача — сутыкнуцца з прафесіяналам, што падзяляе іх пачуцці, разумее іх патрэбы.

"Хацелася б выйсці на вышэйшы ўзровень, каб гледачы не толькі ў Гродне, але і па ўсёй Беларусі змаглі ацаніць яркасць фарбаў, якую здольны паказаць жаночы хор".

— З Марынай Уладзіміраўнай працаваць лёгка. Яна чалавек са свежымі ідэямі. Не баіцца эксперыментаваць, упэўнена вядзе нас за сабой, і гэты шлях творчасці цікавы і выбітны, — распавядае студэнтка 4 курса Гродзенскага музычнага каледжа Яна Шчука.

Згаджаецца з каляжанкай Арсенія Крывуля:

— Марына Уладзіміраўна нядаўна ўзначаліла наш хор. Для кіраўніка вельмі важна, каб калектыў быў дружны і згуртаваны. Педагог старэйшы, мы дапамагаем, і яна нас заўсёды падтрымлівае, прыўносіць шмат новага — як у тэхніцы спеваў, так і ў плане рэпертуару.

ЖАНОЧЫ ГОЛАС, ЖАНОЧЫ КАЛЕКТЫЎ

Нягледзячы на тое што хор называецца жаночы, акрамя 25 дзяўчынак, у ім ёсць і адзін хлопчык. Прынята лічыць, што мутацыя голасу ўласцівая толькі юнакам, аднак процілеглы пол таксама сутыкаецца з ломкай, хай і не такой выразнай. Ахова здароўя — сярод галоўных мэт настаўніка.

— Са звычайнага тоненькага дзявочага галаска неабходна развіць прыгожы жаночы голас. Спецыяльныя практыкаванні, распеўкі — гэта карпатлівая справа, якая патрабуе часу і сіл і ад кіраўніка хору, і ад навучэнцаў, — распавядае пра нюансы працы Марына Уладзіміраўна.

Жаночы голас — тонкі інструмент з мноствам фарбаў. Задача гераіні — раскрыць патэнцыял, агранёць брыльянт, каб ён прыносіў радасць не толькі ўладальніцы, але і слухачам.

— Як спартсмены на трэніроўках распрацоўваюць мышцы, так і спевакі ўдасканальваюць тэхніку дыхання, — дзеліцца сакрэтам майстэрства выкладчык.

Любы жаночы калектыў у масавай свядомасці — ледзь не серпентарый. Аднак хор Гродзенскага музычнага каледжа гэты міф разбурае.

— Калі даведаліся пра новага кіраўніка — расхвалваліся, бо ў кожнага дырыжора ўласнае бачанне: выкарыстоўваюцца аўтарскія тэхнікі, творы трактуюцца па-свойму, — дзеліцца ўспамінамі ўдзельніца калектыву Таццяна Маркевіч. — Аднак Марына Уладзіміраўна забяспечыла цёплую, камфортную абстаноўку ў камандзе. Педагог разумее і падтрымлівае нас. Кіраванне хорам само па сабе — велізарная адказнасць, а падрыхтоўка да абароны звання — тым больш хвалюючы абавязак, дадатковае напружанне. Складана ўявіць, наколькі цяжка было выкладчыцы. Мы таксама стараліся. І агульнымі намаганнямі — справіліся!

ХАРАВАЯ СЯМ'Я

Званне заслужанага аматарскага калектыву хор атрымаў у 2017-м. Але пацвярджаць статус трэба кожныя пяць гадоў. Неабходна весці актыўную канцэртную дзейнасць, паказваць сябе на конкурсах і фестывалях, прычым праграма павінна быць разнастайнай і актуальнай. Ацэньвала дасягненні хору спецыяльная камісія Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь на чале з Дзмітрыем Леанідавічам Сляцарыкам, намеснікам начальніка ўпраўлення культуры і народнай творчасці міністэрства.

— Спявалі па 3–4 гадзіны на дзень. Гэта вялікая нагрузка на галасавы апарат. Было складана не толькі ў фізічным, але і ў маральным плане, — адзначае Марына Уладзіміраўна.

Разыначка харавога мастацтва ў тым, што поспех залежыць ад кожнага ўдзельніка калектыву. Адзін можа выканаць партыю ідэальна, а іншы — сфальшывіць. Ад гэтага атмасфера распадвалася.

— Вядома, у нас здараліся непаразуменні: усе людзі творчыя, яркія. Аднак у рэнце рэшт заўсёды прыходзілі да згоды, — распавядае Арсенія Крывуля.

— За пару месяцаў належала разабраць, вывучыць і адшліфаваць 18 кампазіцый. Мы вымотваліся, але ўсведамлялі, што працаваць трэба, — дадае Таццяна Маркевіч.

Нягледзячы на цяжкасці, дзяўчаты з'ядналіся і ўспрынялі выклік як новы вопыт.

— Цягам бясконцых рэпетыцый і прагонаў мы зблізіліся і сталі сапраўднай харавой сям'ёй, — усміхаецца Яна Шчука.

НІКОЛІ НЕ СПЫНЯЦЦА

Званне пацвердзілі, але на дасягнутым ні кіраўніца, ні яе выхаванкі спыняцца не збіраюцца. Дзяўчаты хочуць працягнуць навучанне ў прафільнай ВНУ, бо не прадстаўляюць жыцця без спеваў. І ў Марыны Уладзіміраўны поўна планаў:

— Хацелася б выйсці на вышэйшы ўзровень, каб гледачы не толькі ў Гродне, але і па ўсёй Беларусі змаглі ацаніць яркасць фарбаў, якую здольны паказаць жаночы хор.

Маладая настаўніца прагне развіцця айчыннай харавой кампазітарскай школы, дадае ў рэпертуар сучасную музыку, марыць зрабіць жаночае харавое выканальніцтва больш актуальным, цікавым і папулярным.

Ксенія ЗАРЭЦКАЯ

Беларускі народны каляндар на 2023 год

Народны каляндар — гэта сістэма зафіксаваных у фальклоры свят, ігрышчаў, абрадавых звычаяў, прысвяткаў, працоўных дзён, якая адлюстроўвае прыродна-храналагічныя веды беларусаў. Асобныя старадаўнія прыкметы надвор'я, звязаныя з пэўнымі датамі, цяпер ужо страцілі актуальнасць, некаторыя звычаі засталіся толькі ў гістарычнай памяці, іншыя ж актыўна бытуюць і сёння.

Сістэматызаваны беларускі народны каляндар з яго велікодна-валачобнымі песнямі, што ў строгай храналагічнай паслядоўнасці апісваюць прысвяткі і святы, ёсць нацыянальным шэдэўрам і фенаменальнай з'явай сусветнай нематэрыяльнай культуры. Акрамя таго, валачобныя песні, што выконваліся на Вялікдзень, даўнейшы Новы год, — гэта своеасаблівае паэтычнае кола жыцця.

У народным календары на 2023-і прадстаўлены асноўныя святы і прысвяткі з кароткімі тлумачэннямі, прыкметамі, прымаўкамі, урыўкамі з валачобных песень і г. д. Дні, якія адзначаюць беларусы-католікі, выдзелены курсівам. Зорачкай (*) вылучаны святы рухомай царкоўнай пасхаліі, што не маюць сталага месца ў годзе.

Умоўныя абазначэнні: **п** — панядзелак, **а** — аўторак, **с** — серада, **ч** — чацвер, **пт** — пятніца, **сб** — субота, **н** — нядзеля. Астранамічныя звесткі, пададзеныя ў тэксце, адносяцца да Мінска. Больш падрабязна пра значэнне хранонімаў можна прачытаць у кнігах "Беларускі народны каляндар" (Мінск, 1993, 2002) і іншых.

СТУДЗЕНЬ

1. н. Новы год. ВКЛ перайшло на студзеньскі стыль у 1550 г., Расія — у 1700 г.

6. пт. Першая, Посная куцця. Перадкалядная вячэра. Які дзень, такі і год. ***Богаз'яўленне, Тры Каралі.*** Католікі праводзілі маскіраваны абрад "Тры каралі", або "Гэроды".

7. сб. Раство Хрыстова. Пачатак **Каляд.** "Ой, Калядачкі, бліны-ладачкі…". Калядавалі. Насілі "звязду". Паказвалі батлеечныя спектаклі, праводзілі ігрышчы ("вадзілі казу", "жанілі Цярэшку", "пяклі ката", гулялі ў "Яшчура" і інш.).

9. п. Сцяпан. Даўней дзень найму слуг, батракоў на год. "На святога Сцяпана вышэй слуга за пана".

13. пт. Шчодрая куцця. Пачатак **Шчодрага тыдня.** "Мароз, хадзі куццю есці".

14. сб. Васілле. Новы год па праваслаўным календары. "Сею, сею, пасяваю, з Новым годам вас вітаю".

18. с. Трэцяя, Галодная, Вадапосная куцця. Апошнія дні Каляд. "Каляда ад'язджае".

19. ч. Вадохрышча (Кшчэнне). "Святое Кшчэнне ваду ксціла…, свет ачысціла і ваду наверх пусціла", "На Вадохрышча завіруха — на Вялікдзень таксама".

20. пт. Прывадохрышча – заканчэнне Каляд. Пачатак **Малой вясельніцы** (да посту).

24. а. Аксіння. "Аксіння дарогу перамяце, а корм падмяце". **Фядос.** "На Фядоса цёпла".

25. с. *Павел.* "Вее вецер — будзе вайна". **Таццяна.** Свята студэнтаў.

31. а. Апанас, Гусінае свята. Свята свойскай жывёлы. "Хавай нос у апанасаўскі мароз".

ЛЮТЫ

1. с. *Ігнат.* "На Святога Ігната зіма багата".

2. *ч. Грамніцы, Стрэчанне.* "Калі на Грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я наесца вол травіцы", "Грамніца — хлебу палавіца".

5. *пт. Агата.* Каровіна свята. "Хлеб і соль святой Агаты не пусціць бяды да хаты".

6. п. *Дарота.* "Па Дароце высахнуць хусты на плоце". **Паўзіміца Аксіння.** "На Аксінні мяце", "Які дзень на Аксінню, такая будзе і вясна".

11. сб. Ігнат. "Ігнат Грамніцам рад".

12. н. Стрэчанскія Дзяды.

13. п. Пачатак ***Памінальнага, Дзедавага тыдня.**

14. а. *Валянцін.* Свята закаханых. **Трыфан.** "На Трыфана зорна — вясна позняя".

15. с. Грамніцы, Стрэчанне. "Зіма з летам сустракалася, пра здароўейка пыталася", "На Грамніцы палавіна зіміцы".

17. пт. *Дзедава пятніца.

18. сб. Агата. Каровіна свята. ***Памінальніца.** Канец **Памінальнага тыдня**. Калі "вея" ў нядзелю, то авёс трэба сеяць на 9-м тыдні, калі ў панядзелак — то на 8-м, калі ў сераду ці чацвер — то пакідалі "дзесяцінкі дзве".

20. п. *Рабы тыдзень, Вясельніца, Развітальны, Сырапусны, Масленічны тыдзень. Тыдзень перад Масленіцай. Які добры дзень на Масленым тыдні, у той дзень ад Ілы сеялі лён. Дзяўчаты вешалі "калодкі" нежанатым хлопцам. ***Дзень сустрэчы** на Масленым тыдні.

21. а. *Залвіцыны вячоркі.

22. с. **Серада Папяльцовая* (пачатак Вялікага посту ў католікаў, да 08.04). ***Лысая серада.** На ўзгорках з'яўляюцца "праталіны-залысіны".

23. ч. *Блакітны чацвер. Тумановы дзень. ***Крывы, Тлусты чацвер, Валосы, Валосся.** Свята жывёлы. "На Валосага бліны пяклі ці аладкі, каб былі валы гладкі".

24. пт. *Мацей.* "На Мацея дарога пацее", "На Мацея адліга — будзе мароз". **Уласcе, Аўлас.** Свята жывёлы. "Аўлас на сыры лас", "Ты, Улас, Улас, ты найміся ў нас скату пасцівіць". ***Цешчыны вечары.**

25. сб. *Масленыя Дзяды (Бабы). "Дзяды не зналі бяды, а нашы ўнукі зазналі мукі".

26. н. *Масленіца. "Масленіца ў «вятху» (пасля поўні) — дзяржы пшаніцу ў мяху, сей пшаніцу на ўсю руку". ***Развітальны, або Дараваны, дзень. *Гуканне вясны.** "Блаславі, божа, зіму замыкаці, вясну загукаці". На Палессі вадзілі карагоды, "спявалі чырачку", насілі елку з вянком. **Фацiння.** Заступніца ад хвароб (ліхаманкі, трасцы і інш.).

27. п. *Паласказуб. Першы дзень **Вялікага посту** (да 15.04). Паласкалі зубы гарэлкаю (у час посту больш не пілі).

САКАВІК

1. с. *Уступная серада. Каб урадзіў лён, мылі верацёны ці калаўроты, хадзілі ў карчму і пераскаквалі цераз пень.

4. сб. *Казімір.* "Святы Казімір дровы сякець і ў клад кладзець". ***Зборава субота.** Абрад "споведзі дзежкі".

5. н. Васіль Капальнік. Са стрэх капае. ***Зборніца, Ізбор.** Адзін з варыянтаў Новага года / лета пасля прыняцця юліянскага календара. "Святы Ізбор упярод ступіць". Пачатак збору селяніна ў поле.

9. ч. Янка, Паўраценне. Мядзведзь паварочваецца ў берлагу на іншы бок.

12. ч. *Рыгор.* "На святога Рыгора ідуць рэкі ў мора".

14. а. Аўдоцця Вясноўка, Аўдокі. Гуканне вясны. "На Аўдокі голы бокі". (01.03 — Новы год / лета ў мінулым, сакавіцкі калядарны стыль). "Святы Еўдакей… пераступ года", "Калі на Аўдакеі добрае надвор'е, то будзе добры лён".

15. с. Хвядот. "На Хвядота занос — усё сена знясе".

17. пт. Герасім Гракоўнік. "Герасім гракоў прыгнаў".

19. н. *Язэп.* "Святы Язэп сярод посту шлюб дае прахвосту", "На Язэпа пагода — год ураджайны".

20. п. Веснавое раўнадзенства. 28-ы месячны дзень, "збыта". *Пачатак **Храстовага тыдня.** Пяклі "храсты". Засеўкі. Абрад "жаніцьбы коміна".

22. с. Саракі. Было Новым годам / летам. Свята веснавога раўнадзенства. "Дзень з ноччу мераецца", "Святыя Саракі наперад пайшлі". Свята птушак. Прылятае 40 выраяў. "Святыя Саракі ў поле саху валаклі". **Пліска.** "На святога Пліска прабʼець лёд і пліска". ***Серадапосце.** Выпякалі "храстцы".

25. сб. *Дабравешчанне, Звеставанне.* "І птушка гнязда не кладзе". Прылёт бусла. **Гуканне вясны.** Было Новым годам / летам. "Перша свята — нова летца, Благавешчан зямлю сушыць". **Рыгор.** "На Рыгора зіма ідзе ў мора".

26. н. Міжблагавешчыны (да 07.04). Забарона на "запасванне" кароў.

27. п. Пачатак ***Пахвальнага тыдня.** "Дзікая качка яйцом пахваліцца".

30. ч. Аляксей Цёплы. Дзень рыбалова. "На Цёплага Аляксея рыба ідзе на нераст, карова на верас, а бортнік на хвою".

31. пт. *Пахвальная пятніца. Мыццё дзежак.

КРАСАВІК

1. сб. Дар'я Вясенняя. Адбельвалі палотны. ***Пахвальная субота.** Не грымелі кроснамі, каб гром не грымеў.

2. н. **Пальмова (Вербна) нядзеля.* "Вярба б'е, не я б'ю".

5. с. *Арына.* "На Арыну сей капусту ў расадніках".

6. ч. Камаедзіца. Свята мядзведзя. **Благавеснік.** Пяклі пірагі "Буславы лапы".

7. пт. Благавешчанне. "Благавешчанне без ластавак — халоднае лета". Абрад "Страла".

8. сб. Благуста. "На Благусту сей капусту".

9. н. **ВЯЛІКДЗЕНЬ* **у католікаў.** ***Вербніца.** Асвячалі вярбу, сцябалі ёю, прыгаворваючы: "Не я б'ю, вярба б'е, за тыдзень — Вялікдзень". **Матрона.** "На Матрону шчупак хвастом лёд разбівае".

10. п. Пачатак ***Белага, Вялікага тыдня. *Чысты панядзелак.** Бялілі і мылі ў хаце.

11. а. *Чысты аўторак. Каб на людзей і "гаўядо" не напала "парша", трэба ўсё мыць.

12. с. *Дравяная страсць. Мыюць усё драўлянае.

13. ч. *Чысты чацвер. Ідуць у лазню. Абрад мыцця дзежкі.

14. пт. *Чырвоная, Велікодная пятніца. Сеялі гарох. **Прабуджэнне хатніка.** У гэты дзень хлусілі, каб заблытаць хатніка. "Апрэль — нікому не вер". **Мар'я.** Калі ў ясную ноч прыбывае вада, то суха будзе ў жніво на хлебнай ніве.

15. сб. *Вялікая, Чырвоная субота. Фарбавалі яйкі. Канец Вялікага посту. **Палікарп.** "Пачатак бясхлебіцы".

16. н. *ВЯЛІКДЗЕНЬ. "Хрыстос уваскрос! — Сапраўды ўваскрос!" Быў Новым годам. "Першае свята — свята Вялікадня". **Мікіта.** "Калі на Мікіту крыгаход, то няма ні клёву, ні лову рыбаловам".

17. п. Працяг ***Вялікадня.** "Першы дзень пірагі маюць, а сярэдні пагуляюць, а паследні дзень выпраўляюць". У Жыткавіцкім раёне на другі дзень праводзілі свята сена.

19. с. *Градавая серада. Праводны, Мёртвы тыдзень. "Пайшла зіма да Кіева, а лета нам пакінула". ***Людавы дзень.** Раней у Віленскай губерні білі і качалі яйкі з лубкоў, гушкаліся на арэлях.

20. ч. *Вялікадне мёртвых (Наўскі Вялікдзень, Мёртвы Вялікдзень, Наўскі чацвер). Дзень памінання на могілках. Хлопцы і дзяўчаты абліваліся вадою.

21. пт. *Прашчэнне. Абліваліся вадою. **Руф.** Руф рушыць снягі.

23. н. *Праводная нядзеля. "Ідзі, зіма, да Кучава, як ты нам надакучыла". ***Юры.*** (Новы год па задыяку.) "Першае святца — святы Юр'я", "Як зязюля закукуе за 12 дзён да Юр'я на «голы» лес, то не чакай ураджаю і будзе хварэць жывёла". ***Войцах.*** "Святы Вайцеху выпусціў жаўранка з меху".

24. п. *Радаўнічныя Дзяды. Анціп — ахоўнік зубоў.

25. а. *Радаўніца. "На Радаўніцу да абеду пашуць, па абеду плачуць, а к вечару скачуць". ***Марк.*** "Дождж на Марка, дык зямля як шкварка".

28. пт. Пуд. "Пуд снег пугне".

29. сб. Арына. "На Арыну сей капусту на расаду".

30. н. Зосім – ахоўнік пчол. **Андрыянава ноч, Андрэй.** Ноч дзявочай варажбы і чараўніцтва.

ТРАВЕНЬ (МАЙ)

1. п. Кузьма. "Май Кузьма з морквінай сустракае, а Пахом з гурком".

5. пт. Ляльнік. Свята Лялі — дачкі Лады. "Благаславі, маці, // Ой, Лада, маці! // Вясну заклікаці".

6. сб. Юр'е. Свята жывёлы. "Як дождж на Юр'я — хлеб будзе і ў дурня". Абрад "Страла".

7. н. Алісей. "Прыйшоў Алісей — авёс пасей". **Бабскія розбрыкі.** Скокі жанчын і качанне па зямлі дзеля ўрадлівасці. ***Міраносцы.** "На Міраносця п'яныі бабы цігаюць адна адну за валосця".

8. п. Пачатак ***Пераплаўнага (Чарвівага) тыдня. *Станіслаў.*** "Сей лён на Станіслава — вырасце, як лава". **Марк.** "Дождж на святога Марка — дык зямля як шкварка".

10. с. Ярылавіца. Свята Ярылы. ***Градавая, Пераплаўная серада.** Засцярогі ад граду і дажджу.

13. сб. Якуб. "На Якуба грэе люба".

14. п. Макарэй. Абрады ля вады.

15. а. Барыс. Апякун поля і жывёлы.

18. ч. **Ушэсце.* **Унебаўшэсце пана Езуса.** Свята агляду жыта. **Арына Расадніца.** Дзень высаджвання расады ў Паазер'і.

19. пт. *Градабойцы, Ледавіты дзень (Віленская губ.).

20. сб. Антоній. "На святы Антоній сей авёс для коней, а як удасца, дык і прадасца".

21. н. Іван Веснавы. Апякун земляроба. "На Івана каласок, а на Пятра піражок".

22. п. Мікола Веснавы. Свята пастухоў. ***Алёна.*** "Сей лён на Алену, будзе кашуля па калена".

23. а. Зілот. "Сей пшаніцу на Зілота, і яна будзе, як злота".

24. с. Макей. "Мокра на Макея — і лета не прасушыць". **Кірыла і Мяфод.** Калі дзень мокры — і лета будзе мокрае.

25. ч. *Ушэсце. Абрад "Страла". **Епіфан.** "На Епіфана раніца ў чырвоным каптане, неба з барваю — гарачае лета".

27. сб. Сідары. "Прыйшлі Сідары — прыйшлі і сіверы".

28. н. **Пяцідзясятніца (Узнясенне Святога Духа).* ***Сёмуха, Зялёныя святкі, Святы Дух.*** Свята зелені. "На Духа будзе цёпла і суха". **Пахом.** "Святы Пахом павее цяплом". "Сей агуркі на Пахом — будзеш насіць мяхом".

29. п. *Магдалена.* "Магдалена зязюльку прысылае".

31. с. *Градавая серада. Шэсць дзеў. "Лён сей позні". **Канапелька Матруна.** "У зямлю махнула". **Фядот.** "Як на дубе апушка — у Фядота поўна аўса кадушка".

ЧЭРВЕНЬ

2. пт. Тры пакутнікі. "Няма лета, але пасля іх не бывае зімы".

3. сб. *Сёмушныя Дзяды. *Духавая субота, Зялёная субота. Свята маладой зяляніны. "Завівалі" вянкі, бярозкі. **Алёна, Ульяна.** Дзень ільну.

4. н. *Сёмуха, Тройца. Культ продкаў і расліннасці. "Павядзём Куста пад гай зялёненькі…". **Васіліск.** "Ад Васіліска і салавей блізка".

5. п. *Святы Дух. "На Святога Духа не скідай кажуха". Садзілі капусту і каноплі. ***Русальніца, Іван ды Мар'я.** Праводзіны вясны. "На Граннай нядзелі Русалкі сядзелі…". **Дзень Ефрасінні Полацкай.** Хадзілі ў Полацк абракацца.

6. а. *Конскі Вялікдзень. Свята коней. **Юстын і Харытон.** "Юстын цягне ўверх каноплі, а Харытон – лён".

7. с. *Градабой, Серада Русаль. Здабывалі з ясеня святы агонь. **Ян.** "Рой перад Янам — пчаляр будзе панам".

8. ч. *Наўская Тройца, Абліваха. Памінанне продкаў на могілках.

11. н. *Русальчыны розыгры. Засцерагаліся рос. ***Пятроўскія запускі.** Развівалі вянкі.

12. п. *Пятроўка, Петравіца. Пятроўскі пост да 11.07. **Пятроўка-галадоўка**.

13. а. *Антоній.* "Антоні, аддай коні". **Ерамей.** "Прыйшоў Ерамей — больш не сей".

15. ч. *Дзявятнік. Перавод уніятаў у праваслаўе. "Дзеўяць ягодзін на галінцы".

16. пт. *Дзевятуха. Дзень засцеражэння ад навальніцы. **Лук'ян.** Паўднёвы вецер на Лук'яна — на добры ўраджай яравых.

21. с. Летняе сонцастаянне. Маладзік, 4-ы дзень. **Тодар.** "На Тодара раса — канапель паласа".

22. ч. ***Дзясятнік.** "Дзясятнік гнаі возіць". **Кірыла.** Пачыналі касавіцу ў Паазер'і.

23. пт. *Купала.* У старажытнасці — Новы год / лета. ***Дзясятка.** "Косы точыць". "Жыта паспявае".

24. сб. *Ян Купальны.* "Сонца грае".

25. н. Анапрэй. "Хто на Нупрэя пасее грэч, той будзе бліны печ".

26. п. Акуліна Грачышніца. Сеялі грэчку. **Задзярыхвост.** Каровы "зыкуюць".

28. с. Амос. "Прыйшоў Амос — цягне ўгору авёс".

29. ч. Ціхан. "Пеўчыя птушкі заціхаюць". ***Пятрок.*** "Да Пятра зязюльцы кукаваці". "Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйдзе Ілья — атадуць і два".

ЛІПЕНЬ

6. ч. Купалле. Свята Сонца і кахання. "Дзень адбаўленне, ночы прыбаўленне".

7. пт. Іван Купала. "Учора была Купала, а сёння Іван".

8. сб. *Данат.* "Святы Данат коскі точыць".

10. п. *Сем братоў.* "Сем братоў варожаць, колькі тыдняў пагоды". **Самсон.** "На Самсона дождж — сем тыдняў то ж".

12. с. Пятро. Свята заканчэння Купалля.

13. ч. Паўпятро. Дзень талакі. **Сымон і Юда.** "На Сымана й Юды конь баіцца груды".

14. пт. Кузьма і Дзям'ян. Свята кавалёў. "Святы Пятро жыта спеліць, святы Кузьма сярпы робіць, а святы Дзям'ян сена грабе".

17. п. Андрэй. "Авёс у світцы, а на грэчцы і кашулі няма", "Андрэй усіх мудрэй".

18. а. Свята Месяца. "Месяц гуляе".

21. пт. Казанская, Градавы дзень. Засцераганне ад нябесных стыхій, ад хвароб вачэй і галавы. **Пракоп.** Пракоп бок прыпёк.

25. сб. *Якуб.* "На Якуба хлеба поўна губа". **Прокл.** Засцерагаліся вялікіх рос.

26. с. *Ганна.* Снапы кладзе. **Гаўрылей.** Засцеражэнне ад граду.

29. сб. Афінаген. Заціхаюць птушкі.

30. н. Серпавіца, Шыпілінка (пятніца перад Ільёй). Дзень "зазубрывання" сярпоў перад жнівом.

ЖНІВЕНЬ

1. а. Макрыны. "Глядзі восень па Макрыні".

2. с. Ілья. Свята дажджоў і навальніц. "Ілля нарабіў гнілля", "Укінуў у ваду кусок ільда".

4. пт. Мар'я. "Магдалена — вады па калена".

6. н. Барыс, Палікоп. "Барыс і Глеб — паспеў хлеб".

7. п. Ганны. "Святы Ганны бабкі стаўляюць".

9. с. Палікоп. Паліцькопы. **Панцеляймон.** Вылечваў хваробы галавы.

10. ч. *Лаўрын.* "На Лаўрына спяшай да млына".

12. сб. Сіла. Жыта сей.

14. п. Макавей, Першы Спас. Свята маку і мёду. **Спасаўка.** Пост да 27 жніўня.

15. а. *Прачыстая, Зельная.* "Прыйшла Прачыста — стала поле чыста". **Базыль.** "Базыль авечкам воўну дае".

16. с. Антоны Віхравеі. Рох. "Кірмаш на паненак" — дзень выглядання нявест.

17. ч. Еўдакія. Агуркі збірае.

19. сб. Яблычны Спас. Свята садавіны.

23. с. Лаўрэн – свята млынара. "Баўтрамей і Лаўрын паказваюць, якая прыйдзе восень".

24. ч. *Баўтрамей.* "Святы Баўтрамей высылае буслоў па дзяцей", "Прыйшоў Баўтрамей — жыта на зіму сей".

27. н. Міхей. Выспяваюць брусніцы.

28. п. Прачыстая, Зельная. Свята ўраджаю.

29. а. Трэці Спас. Свята хлеба. **Ян.** "Ян на лета прыйшоў, а ўжо восень знайшоў".

30. с. Міроны Ветрагоны. "Пыл па дарозе гоняць, па прыгожым леце стогнуць".

31. ч. Флор і Лаўр. Свята коней. **Арабінавыя дзень і ноч.** Сухая навальніца або дождж.

ВЕРАСЕНЬ

5. а. Лупа. "Сей на Лупа — будзе жыта купа".

7. ч. Баўтрамей. "Жыта на зіму сей".

8. пт. *Другая Прачыстая.* "Меншая Прачыста — канчай сеяць начыста".

10. н. Мацей. Абаронца ад п'янства.

11. п. Калінавік, Іван Крываўнік. "Да Яна прасіце, дзеткі, дажджу, а па Яне я й сам упрашу".

13. с. Кіпрыян. Журавель збіраецца ў вырай.

14. ч. *Узвіжанне.* Закрыванне зямлі. **Сымон.** Абрад "жаніцьбы коміна". (Асенняе Навалецце / Навагоддзе з 1493 г.) **Бабіна лета.**

19. а. Цуды, Міхал. "Міхал з поля спіхаў".

21. ч. Багач, Нараджэнне Божае Маці. Свята заканчэння ўборкі зерневых. Засідкі.

23. сб. Асенняе раўнадзенства. Падпоўня, расце, 9-ы дзень.

24. н. Тадора. "На Тадору ўсякае лета заканчваецца".

26. а. Стаўроўскія Дзяды.

27. с. Звіжанне. Свята закрывання зямлі на зіму. Гадзюкі збіраюцца ў кучу.

29. пт. *Міхал.* "Калі на Міхала з поўначы вецер вее, то не май на надвор'е надзеі". ***Сіцыян.*** "Святы Сацыян ды ляны пасцілаў".

КАСТРЫЧНІК

2. п. Зосім. Журавіны на Зосіма ўздымаюцца — мароз на Пакровы ўдарыць.

4. *с. Пранцішак, Францішак.* "На Пранцішка зярнят шукае ў полі мышка".

8. н. Сяргей. "З Сяргея пачынаецца зіма". **Жалезны тыдзень.** Чысцілі жалезныя рэчы.

9. п. Іван Шаптун, Іван Кураед, Багаслоў. Шапталіся сваxі пра нявест. "Іван Багаслоў дружкі разаслаў, а на Пакрова дзеўка гатова". "Святы Багаслоў да буракі капаў".

14. сб. Пакровы, Трэцяя Прачыстая. Вясельная пара. "Свята Пакрова, пакрый зямельку лісточкам, а галоўку — вяночкам", "Пакровы — зарыкалі каровы", "Калі на Пакрову маладзік, то будзе лёгкая зіма. З поўначы вецер — халодная зіма, з поўдня — цёплая". **Дзявоцкае лета** (да 21.10). Прымалі "ў дзеўкі" сяброўак.

21. сб. *Зміцер.* "Да Змітра баба хітра". **Трыфан, Палагея.** "Золкім ветрам вее".

25. с. Марцін — свята млынароў. Частаваліся гусяцінай на млынавым коле. "Марцін святы — любіцель гагаты".

28. сб. *Сымон і Юда.* "Сымон з Юдаю працу ў полі канчаюць, хаты аглядаюць". ***Параскева Пятніцкая.*** Забарона на прадзенне.

29. н. Лонгін. Збаўца ад хвароб вачэй.

30. п. Паклоны. Дзень адбівання паклонаў.

31. а. Лука. "Хто сее да Лукі, не будзе мець ні хлеба, ні мукі". Дзень іканапісцаў. ***Юльян*** — ахоўнік дзяцей.

ЛІСТАПАД

1. с. *Усе Святыя.* "Усе Святыя як засваволяць — дрэвы да рэшты аголяць".

2. ч. *Задушны дзень.* Памінальны дзень.

4. сб. Асяніны, Змітраўскія Дзяды. "Святыя дзяды, завём вас…". **Казанская.** "Да Казанскай — не зіма, а пасля — не восень; зранку дождж, з вечара — снег. Выязджай на Казанскую на калёсах, а палазы з сабой прыхапі".

8. с. Зміцер. "Да Змітра дзеўка хітра". Канец надзеі выйсці замуж у гэтым годзе.

9. *ч. Тодар.* "На Тадора поўна камора".

10. пт. Параскі. Апякунка жанчын і рукадзелля.

11. сб. *Марцін.* "Мядзведзь кладзецца ў бярлогу". **Настуся.** "Настуся стрыжэ авечкі".

12. н. Артошка. Пачатак прадзення.

14. а. Кузьма-Дзям'ян. Апякун земляробства, кавалёў і вяселля.

21. а. Міхайлаў дзень. Абаронца ад грому. "Мядзведзі ідуць у спячку", "Міхайла ў інею — снежная зіма наступае, а калі туманамі спавіты — быць адлізе" (такія ж прадказанні і на Матрону).

22. с. Матрона. "З Матроны становіцца зіма".

24. пт. Хвёдар Студзянец. "Хвёдаравы вятры галоднымі ваўкамі скуголяць".

25. сб. *Кацярыны.* "Кацярына забрала лета". **Іван Міласцівы.** Дзень падарункаў.

27. п. Юстыніян. Апякун плоднасці і дзяцінства. **Піліп.** Пярэдадзень Піліпаўскага посту.

28. а. Піліпаўка — перадкалядны пост (да 06.01).

29. с. Мацей. "На Мацея зіма пацее".

30. ч. *Андрэйкі.* Дзявочае свята.

СНЕЖАНЬ

3. н. **Адвент.* **Калядны пост.**

4. п. *Барбара.* "Барбара ноч урвала, а дзень надтачыла". **Увядзенне.** Водзяцца ваўкі.

5. а. Пракоп. *Савы.* "Барбара мосціць, Сава цвікі войстрыць, а Мікола прыбівае".

6. с. *Мікола.* "Хвалі зіму па Міколе". **Матрыхваны.** Не пралі.

7. ч. Кацярыны. "Забрала край лета".

9. сб. Юр'е Зімовы. Юра масціць. ***Ганны.*** "Ад Ганны да Каляд два тыдні і два дні".

10. н. **Адвент.*

13. с. Андросы, Андрэйкі. Варажылі.

14. ч. Навум. "Настаўвіць на вум". Пачыналі вучыць дзяцей грамаце.

17. н. **Адвент.* **Варвары.** "Мікола і Варвара ноч урвалі".

18. п. Савы, Міколаў бацька. "Сава мосце, а Мікола гвоздзе".

19. а. Мікола Зімовы. "Без Міколы не бывае ні зіма, ні лета". "Мікола марозам гвоздзіць".

21. ч. Зімовае сонцастаянне. Падпоўня, расце, 10-ы месячны дзень.

22. пт. Ганны. "Ганны — прыбавіцца багата дня", "Ганкі — палічаны дзянькі".

24. н. **Адвент. Посная куцця.* Пачатак Каляд (да 06.01).

25. п. *Божае Нараджэнне.* Было Новым годам. "Свята Ражаство ўпярод пашло, Новы гадок павёў радок". **Спірыдон Сонцаварот.**

26. *а. Сцяпан.* Дзень найму батракоў у мінулым. "На Святы Сцяпан кожны сабе пан".

31. н. *Багатая куцця. Сільвестр.* Варажылі дзяўчаты. **Марк.** "Марка да Варка — няхай будзе парка".

Алесь ЛОЗКА

Прэм'ера музычнай казкі-феерыі "Навагодняя гісторыя Снежнай Каралевы"

Час цудаў

Нават стаўшы дарослымі, мы верым у здзяйсненне загаданых пад бой гадзінніка жаданняў. Кожны з нас спадзяецца, што адбудзецца няхай маленькі, але цуд. І гэта спраўджваецца. А часам мы ствараем цуды самі.

У СВЯТОЧНЫМ КАРАГОДЗЕ

Так, на сцэне **Светлагорскага** цэнтра культуры адбылася прэм'ера музычнай казкі-феерыі "Навагодняя гісторыя Снежнай Каралевы". Пастаноўку па сцэнарыі Галіны Капецкай (дарэчы, нашага сталага аўтара) ажыццявіла рэжысёр народнага тэатра "Авантура" Ніна Друзік. Ролі герояў выканалі члены трупы тэатра, трупы "Авантураты" і ўдзельнікі дзіцячых творчых калектываў, тым самым стварыўшы цуд для сябе і ўсіх прысутных. Спектакль змаглі паглядзець амаль усе ахвотныя — паказаны ён быў пяць разоў, таксама ў і рамках рэспубліканскай дабрачыннай акцыі "Нашы дзеці".

У **Лідскім раёне**, піша Кацярына Сандакова, бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу, свой уклад у стварэнне святочнай атмасферы для дзяцей унеслі бібліятэкі. Іх супрацоўнікі імкнуліся зрабіць мерапрыемствы вясёлымі, напоўненымі цудамі, гульнямі, конкурсамі. Не абышлося без навагодніх прадказанняў, зімовай віктарыны і раскадзіроўкі "сюрпрызу з загадкамі". А хтосьці змог прымерыць і каўпак чараўніка.

"Навагодні хайп-парад" прайшоў па цэнтральнай вуліцы **Смаргоні** і завяршыўся ля гарадской ёлкі забаўляльнай праграмай, падчас якой знайшлося месца конкурсу на "лепшы аўтадызайн", святочны, зразумела.

Выдатнікаў вучобы, пераможцаў творчых конкурсаў, прадметных алімпіяд і спартыўных спаборніцтваў, выхаванцаў дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, дзяцей са шматдзетных і прыёмных сем'яў у рамках акцыі "Нашы дзеці" на навагодняе прадстаўленне запрасіў Смаргонскі раённы цэнтр культуры. У зале сабралася амаль 400 чалавек! Відаць, таму і Дзядоў Марозаў было некалькі, каб ніхто не застаўся без салодкага падарунка. Пра ўсё гэта паведаміла Ілона Смагур, загадчык сектара рэкламы і менеджменту Цэнтра культуры.

А вось у **Свіслацкім раёне** правялі акцыю "Віншаванне з Новым годам дома" для жыхароў аграгарадкоў і вёсак і адзінокіх грамадзян сталага ўзросту маланаселеных і аддаленых вёсак. Як піша метадыст Цэнтра культуры і народнай творчасці Ірына Русак, ініцыятарамі сталі работнікі клубных устаноў рэгіёна. У кожным доме былі радыя гасцям.

Навагоднія святы адзначылі і ў Лідзе

Канцэртная шоу-праграма "Калядныя сустрэчы"

ПАД ВІФЛЕЕМСКАЙ ЗОРКАЙ

У **Віцебскім абласным краязнаўчым музеі** адкрылася выстава "Калядныя гісторыі і традыцыі". Нядзельныя школы храма Уваскрэсення Хрыстова і храма іконы Божай Маці "Ацаляльніца" вырашылі пазнаёміць жыхароў і гасцей горада з традыцыямі Раства: як яго святкавалі раней, у тым ліку ў гады Вялікай Айчыннай вайны, і якія калядныя звычаі сёння.

На **Ашмяншчыне** існуе даўняя завядзёнка — праводзіць канцэртную шоу-праграму "Калядныя сустрэчы". Іх чакаюць, да іх рыхтуюцца. Гэтае свята песні, танца, тэатральнага і сцэнічнага майстэрства, як адзначае Ганна Давідовіч, дорыць непаўторныя адчуванні радасці, весялосці, яднання. Вось і сёлета самадзейныя артысты расчынілі дзверы раённага цэнтра культуры для сваіх гледачоў. Ашмянцы любяць таленавітых землякоў і ганаракца іх творчасцю, падтрымліваючы авацыямі кожнае выступленне.

РОДНАЯ ЗЯМЛЯ

Тамара Круталевіч, загадчык аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці **Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі**, справядліва адзначае, што цікавасць да гісторыі роднага краю фарміруецца з маленства, а любоў і гонар за Бацькаўшчыну — з ведання гісторыі. У раёне нямма гісторыка-краязнаўчага музея, і яго функцыю ўзяў на сябе інфармацыйна-краязнаўчы цэнтр бібліятэкі. Сюды прыязджаюць школьнікі з усяго раёна, у душы якіх гарыць агеньчык зацікаўленасці падзеямі, што адбываліся на іх малой радзіме. Хлопцы і дзяўчаты з непрыхаваным інтарэсам разгадваюць заданні з таямнічага куфэрка і з дапамогай бібліятэчнага краязнаўча-экскурсавода здзяйсняюць вандроўкі па старонках летапісу старадаўняга мястэчка Беразіно, знаёмяцца з лёсамі выбітных сыноў краю.

Як дзецям лягчэй засвоіць беларускую мову? Адказ на гэта пытанне ведае наваполацкая паэтка, член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Ірына Багданава. Гэта пацвердзіў новы зборнік яе вершаў "Разважалкі", піша Нэлі Радзько.

У кнізе 17 тэматычных раздзелаў. Ёсць вершы пра здаровы лад жыцця, святы, жывёл, культуру паводзін і мовы, нават пра інтэрнэт. Кніга можа служыць своеасаблівым падручнікам для пазакласнага навучання — каб дзеці часцей выкарыстоўвалі родную мову. Дарэчы, прадставіць творчасць паэткі прыйшлі юныя выхаванцы тэатра мініяцюр "Усмешка" Палаца дзяцей і моладзі.

Прэзентацыя новага зборніка прайшла ў бібліятэцы імя А.С. Пушкіна. Павіншаваць пісьменніцу прыйшлі супрацоўнікі Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы на чале з яе загадчыцай Марыяй Караваевай.

А што цікавае адбылося ў вас?

Вера НІКАЛАЕВА

Гродзенская вобласць

Бібліятэкі **Астравеччыны** далучыліся да рэспубліканскай акцыі "Нашы дзеці". Супрацоўнікі кніжных скарбніц правялі мерапрыемствы, накіраваныя на дапамогу шматдзетным сем'ям і дзецям-сіротам, і зрабілі сапраўднае свята для дзяўчынак і хлопчыкаў і іх бацькоў. Філіял "Дзіцячая бібліятэка" паўздзельнічаў у дабрачыннай ініцыятыве "Арыфметыка дабра", у Міхалішкаўскай сельскай бібліятэцы зладзілі імпрэзу "Давайце рабіць добрыя справы", а Падольская сельская бібліятэка-клуб пазнаёміла шматдзетную сям'ю з кніжнай выставай "Навагодняя казка".

■■■

У Масалянскай інтэграванай сельскай бібліятэцы на **Берастаўччыне** адбыўся тэматычны вечар-успамін "Зазірнём у сямейны альбом". Удзельнікі аматарскага аб'яднання "Ладачкі" падзяліліся фотаздымкамі і гісторыямі, расказалі пра свае традыцыі і паразважалі пра мінулае.

■■■

Турнір знаўцаў для дзяцей "Яго вялікасць куфар: аповед-экскурс" арганізавалі ў **Лідскай** гарадской бібліятэцы № 3. Канкурсанты дакрануліся да гістарычнага мінулага краіны: пазнаёміліся з народнымі звычаямі і паглыбілі веды пра побыт старажытных беларусаў.

■■■

У **Смаргоні** запалілі агеньчыкі на галоўнай ёлцы горада. Мерапрыемства "Навагодні стрым" прайшло ў стылі TikTok, што прывабіла дзяцей і дарослых. На святкаванне таксама былі запрошаны Дзеды Марозы і Снягурачкі з усёй Смаргоншчыны.

■■■

Святочную імпрэзу "Калі прыходзяць дзівы" правялі ў Каменскай інтэграванай бібліятэцы на **Шчучыншчыне**. Удзельнікі вызначылі найлепшага знаўцу незвычайных аповедаў у віктарыне "Казка за казкай", пагуляілі ў "Чароўны тэлеграф" і атрымалі прызы, адзін з якіх, сімвал 2023 года — труса, зрабілі сваімі рукамі.

Магілёўская вобласць

Даведацца пра асаблівасці народнага лялечнага тэатра, гісторыю самабытных персанажаў і паглядзець класічную калядную батлеечную пастаноўку "Цар Ірад" можна ў **Магілёўскім** абласным мастацкім музеі імя П. В. Масленікава. Першыя госці — вучні мясцовага ліцэя № 3 — ужо акунуліся ва ўтульную святочную атмасферу.

Віцебская вобласць

Музей гісторыі і культуры горада **Наваполацка** запрашае на выставу мастака Сяргея Данілава "2 ГРАНІ". У экспазіцыі прэзентаваныя ювелірныя вырабы і карціны, прысвечаныя Віцебшчыне і Грузіі. Праект даступны да 16 студзеня.

■■■

Віцебскі абласны краязнаўчы музей заклікае паўздзельнічаць у інтэлектуальным навагоднім квэсце "КвестоКоД". Адправіцца ў падарожжа па ўстанове, каб знайсці сімвал 2023 года, — добры занятак для тых, каго цікавяць прыгоды і нестандартныя заданні. Расшыфроўка старажытнага летапісу, пошук скарбу і збіранне пазлаў — усё гэта чакае гульцоў.

На свята і ў будзень

Ажурная лілея, кошыкі з кветкамі, навагоднія вяночкі, званочкі, ялінкі, пано, мініяцюрныя букецікі, паветраныя павукі, жаночыя абадкі, капелюшы — і ўсё гэта з саломкі. Прыгажосць і разнапланавасць беларускага золата, якое цяпер мае статус нематэрыяльнай культурнай спадчыны UNESCO, на сваёй выставе прадставіла наваполацкая майстар Нэлі Радзько.

Экспазіцыя пад назвай "На свята і ў будзень. Магія саломкі" распачалася ў гарадскім музеі напярэдадні Калядаў. Яе аўтар неаднаразова прадстаўляла Наваполацкі цэнтр рамёстваў і традыцыйнай культуры на шматлікіх рэгіянальных, абласных, рэспубліканскіх фестывальных пляцоўках, кірмашах, "Гарадах майстроў". Заваявала безліч узнагарод, сярод якіх і першае месца на III Абласным свяце-конкурсе саломапляцення "Папараць-кветка", што праходзіў у межах Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску — 2010", гарадская прэмія за высокія творчыя дасягненні ў сферы культуры і мастацтва "Прызнанне". Лепшы твор майстра нават уключылі ў кнігі "Народныя майстры і мастакі Віцебшчыны" і "Народнае мастацтва Віцебскага Паазер'я", выдадзеныя Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці.

У 2009-м Нэлі Радзько стварыла лілею — сімвал Наваполацка. Аўтарская распрацоўка стала брэндавым падарункам для прадстаўнічых дэлегацый. Кветку ўручалі гасцям з Расіі, Кітая, Германіі. А ў 2019-м саломапляцельшчыца выканала галаўныя ўборы для вядучага калектыву мясцовага цэнтра культуры — вакальнай групы ўзорнага ансамбля танца і песні "Прыдзвінскія россыпы", што прадстаўляе культуру раёна на фестывалях па ўсёй краіне і далёка за яе межамі.

На выставе, якая цяпер працуе ў гарадскім музеі, можна ўбачыць лепшыя работы Нэлі Радзько апошніх гадоў. Большасць з іх выкананы сёлета. Гэта разнастайныя пано, кветкі, абрадавыя і ўтылітарныя рэчы, святочныя сувеніры. Цэнтральнае месца займае кампазіцыя "Паўлін". На яе прыкладзе аўтар дэманструе разнастайнасць саламянай творчасці. Толькі хвост гэтай казачнай птушкі складаецца з 50 пляцёнак-"званочкаў".

Нароўні з традыцыйнымі формамі суседнічаюць мадэрновыя.

Асаблівасць творчасці майстра — прага да наватарства. Для большага падабенства з жывымі кветкамі Нэлі выкарыстоўвае адценні пафарбаванай саломкі, з ювелірнай далікатнасцю ўкрапляе ў жаночыя абадкі каляровыя атласныя стужкі, надае бляск лілеі з дапамогай паетак. Дапаўняюць экспазіцыю вырабы вучняў, з якімі майстар працавала ў межах міжнароднага праекта "Паўднёвыя рамеснікі — за захаванне і развіццё традыцыйных навыкаў праз трансгранічнае супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі Латвіі, Літвы і Беларусі" з лістапада 2021-га па сакавік 2022 года. Дзяўчаты завіталі на адкрыццё выставы, выказалі шчырыя словы падзякі ў адрас настаўніцы. Што і нядзіўна. З'яўляючыся ўдзельнікам шматлікіх выстаў народнай творчасці і ўладальніцай ганаровых дыпломаў, Нэлі Радзько сваёй галоўнай узнагародай лічыць дасягненні любімых вучняў. З клопатам і трапятаннем ставіцца да іх. Невыпадкова гавораць, што менавіта праз цёплыя чалавечыя адносіны ствараецца сапраўдная магія — магія мастацтва.

Наталля ХАРЫНА
Фота Алены ЕМЯЛЬЯНАВАЙ

Паспець заспець!

Фрагмент выставы "Шчасце ў кішэні"

Пачатак года — важны перыяд, які трэба напоўніць светлай, пазітыўнай энергіяй. "Культура" паклапацілася, каб зарадзіць вашы 365 дзён на поспех і аптымізм. Мы сабралі падзеі, на якія трэба патрапіць да канца студзеня, — натхненне і новыя сілы гарантуем!

Эксклюзіўныя выставы ёлачных упрыгожанняў радуюць наведвальнікаў адразу ў двух гарадах — Мінску і Віцебску! Асабістую калекцыю прадстаўляе рэстаўратар навагодніх цацак Наталля Кавалёва. Яе збор налічвае больш за пяць тысяч экзэмпляраў. У цэнтры ўвагі — шар. Экспазіцыя дэманструе, як з часам змяняліся матэрыял, дэкор і сюжэты роспісу, а таксама дазваляе адсачыць эвалюцыю традыцыйнага элемента Новага года. Асобнае месца займаюць вырабы 1930—1980 гадоў з былога СССР, часоў Вялікай Айчыннай вайны, калі замест шароў выкарыстоўвалі электрычныя лямпачкі, размаляваныя ўручную.

Пазнаёміцца з навагодняй экспазіцыяй і паглыбіцца ў гісторыю ёлачных аздабленняў можна да 22 студзеня ў **Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага** і да 31 студзеня ў **Музеі гісторыі прыватнага калекцыянірання**.

■■■

Вас натхняе бяскрайні космас? **Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь** запрашае паглыбіцца ў маштабны выставачны праект **"Чакайце нас, зоркі!"**. У экспазіцыі прадстаўлены архіўныя фота- і відэаматэрыялы, плакаты савецкага часу, прысвечаныя космасу і развіццю навуковых тэхналогій, відэа-арт, саўнд-арт, скульптурныя аб'екты, інсталяцыі, жывапісныя і графічныя работы. Асаблівая каштоўнасць — работы вядучага касмічнага мастака СССР Андрэя Сакалова і касманаўта Аляксея Лявонава, творы з Музея-запаведніка Ю.А. Гагарына (Расійская Федэрацыя). Акрамя гэтага, наведвальнікаў чакае насычаная суправаджальная праграма: экскурсіі, майстар-класы, адукацыйныя мерапрыемствы і прэзентацыі.

Паспейце дакрануцца да зорак да 29 студзеня.

■■■

Мінскі абласны краязнаўчы музей у Маладзечна запрашае на выставу аўтарскай лялькі **"Шчасце ў кішэні"** Кацярыны Камельчык. Мастацкая лялька — гэта ўнікальны, прадуманы да дробязі вобраз і дзіўная разнастайнасць матэрыялаў і тэхнічных прыёмаў. Такая цацка можа стаць упрыгажэннем інтэр'еру або арыгінальным падарункам. Ускалыхнуць светлыя ўспаміны пра дзяцінства можна да 23 студзеня.

■■■

Не страціць святочны настрой і веру ў цуд дапаможа выстава Антаніны Паўлоўскай **"Душы і сэрца натхненне" ў Ганцавіцкім раённым краязнаўчым музеі**. У калекцыі больш за 200 творчых работ: дзіцячыя цацкі, навагоднія аздабленні, кветкавыя букеты і кампазіцыі, ажурныя сурвэткі... Усе экзэмпляры арыгінальныя і маюць сваю іскрынку. Затрымаць яркія пачуцці можна да 20 студзеня.

■■■

Адпачыць ва ўтульнай і цёплай атмасферы могуць жыхары Ушаччыны. На выставе **"Святло душы чалавечай"**, што прысвечана памяці мастака Міхаіла Казіцкага, прадстаўлены карціны з сямейнай калекцыі на біблейскую тэматыку, пейзажы, нацюрморты і партрэты. Ёсць у экспазіцыі і аўтарскія работы дачкі мастака, Антаніны. Яе цацкі і мішкі Тэдзі дапаўняюць святочную экспазіцыю. Наведаць **Ушацкі музей народнай славы** і запаліць святло ў сваім сэрцы можна да 29 студзеня.

■■■

Даведацца пра цікавыя адметнасці беларускай культуры можна і ў **Глускім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі**. На выставе **"Вясельныя сезоны"**, прымеркаванай да 105-годдзя з дня заснавання органаў ЗАГСа, прадстаўлены 15 строяў другой паловы XX стагоддзя. Экспазіцыю таксама ствараюць архіўныя фотаздымкі, альбомы, запрашэнні на ўрачыстасць, святочныя ўборы і аксесуары. Зазірнуць у гісторыю беларускага шлюбу можна да 16 студзеня.

Ніводны навагодні ранішнік не абыходзіцца без Дзеда Мароза і Снягуркі. Сёлета, здаецца, у прэм'ерных спектаклях з'явіліся дадатковыя сімвалы і тэндэнцыі. Сярод апошніх — зварот да лялек і самой эстэтыкі тэатра лялек.

"Гісторыя Кая і Герды (Снежная каралева)"

Кай з Гердай, Трусік, Птушка, Цім і лялькі

Беларускі дзяржаўны тэатр лялек выпусціў "Прададзены смех" у пастаноўцы рэжысёра Яўгена Карняга (гэты ж творца — аўтар інсцэніроўкі і харэограф), мастака Таццяны Нерсісян і кампазітара Кацярыны Аверкавай, якую мы таксама прызвычаіліся бачыць і аўтарам драматургічнай асновы, і найперш рэжысёрам (дарэчы, такое суквецце амплуа, сканцэнтраваных у адной асобе, толькі дапамагае нараджэнню нешараговых сцэнічных рашэнняў).

Спектакль паводле казачнай аповесці Джэймса Круса "Цім Талер, альбо Прададзены смех", увасоблены Міхасём Клімчуком пад назвай "Лялькі Ціма Талера...", з 2019 года ідзе ў Віцебску, у **тэатры "Лялька"**. Пастаноўка была адзначана дыпломам і атрымала званне лаўрэата на міжнародных фестывалях у Махачкале і Тамбове, а галоўнае — удастоілася нашай Нацыянальнай тэатральнай прэміі ў 2021-м ажно ў трох вядучых намінацыях. І пасля ўсяго пералічанага — зноў брацца за гэты ж сюжэт, не баючыся параўнанняў? Але тым і цікавае любое сапраўднае мастацтва — мноствам разнастайных, часам нечаканых прачытанняў.

У спектаклі Я. Карняга ўсё было, наадварот, вельмі і вельмі доўгачакана: палёт фантазій, неверагодная відовішчнасць, "закручанасць" канцэпцыі, нягледзячы на ўзроставую адзнаку "6+". Калі ў віцебскай пастаноўцы прыгоды праносяцца ў шалёным тэмпе, дык сталічная публіка можа спрычыніцца да пераказу і, галоўнае, грунтоўнага і надзвычай цікавага адлюстравання разгалінаваных сюжэтных калізій — з інтэрактывам, але без фінансавай схемы ўзбагачэння на выраба маргарыну (бо 6+, а не 10+, як у Віцебску).

"Прынц і птушачка"

"Прададзены смех"

Відовішчнасць "...смеху" зашкальвае. Гэта папраўдзе штосьці немагчымае! Маленечкая сцэна падзеленая на два паверхі, але задзейнічаная практычна ўся прастора залы: і паветра над гледачамі, дзе праязджае лятучы трамвай, і балкончык для праходу збоку. Сказаць, што выкарыстаныя лялькі розных канструкцый, недастаткова. Вочы папросту разбягаюцца! У пэўны момант нават здаецца, што ўсяго гэтага багацця, якое мільгае перад вачыма, замнога. Але акурат у наступнае імгненне наваколле змяняецца — і ты зноў з непадробным захапленнем дзівішся сцэнічным цудам.

Не забыты і размоўны складнік. Тры артысткі ў маляўнічых строях выступаюць у ролі апавядальніц (і ў адной са сцэн — журналістаў). Прычым зусім не з салодка-казачным "прыдыханнем", а з добрай часткай здаровай іроніі, уласцівай падлеткам і, калі браць шырэй, людзям усіх пераходных узростаў з інтэлігентна выхаваным "чорным" гумарам, што завецца таксама крытычным мысленнем. Падобная праверка на трываласць літаральна кожнай фразы — адзін з апрабаваных прыёмаў смехавой культуры. І адначасова — выпрацоўка ўмення іранізаваць са складанасцей жыцця. А вясёлыя песенькі толькі дапаўняюць нязмушаную атмасферу.

Не абышлося без лялек і ў інтэрактыўнай казцы "Прынц і птушачка", пастаўленай у **Новым драматычным тэатры** маладым рэжысёрам Лізаветай Машковіч: менавіта невялічкія лялькі ўвасабляюць прынца і маленькую дзяўчынку, што вылупілася з яечка, дзякуючы намаганням зусім не рамантызаванай, а гулліва смешнай Феі. Ды ўсё ж не лялькі становяцца адметнасцю спектакля і не ўласна сюжэт са спасылкай на максімальна скарочаную "Дзюймовачку" Андэрсена, а... знешні выгляд персанажаў. Так-так, менавіта іх сцэнічнае аблічча, а не проста дэкарацыі і касцюмы. Мастак Лідзія Малашэнка, добра разумеючы законы тэатра і дзіцячай псіхалогіі, звярнулася да флуарэсцэнтных фарбаў не толькі ў фантазійным адзенні герояў, але і ў грыме. Мастак па святле Уладзіслаў Рыхтэр спрытна змяняе інтэнсіўнасць і саму палітру ілюмінацыі, з-за чаго ў персанажаў узнікаюць усё новыя рысы твараў. Чым не тэатральны эфект? Тым больш што немудрагелісты аповед уяўляе сабой "тэатр у тэатры": каб данесці казку, артысты пераапранаюцца, скарыстаўшы рэквізіт.

Ажно тры спектаклі на малой сцэне канцэртнай залы "Мінск" падрыхтаваў **Аўтарскі тэатр Вольгі Прохаравай**. Да праваслаўнага Раства Хрыстова — "Калядны светлячок" з філасофскім ухілам. Крыху раней, да навагодняга свята, — забаўляльны "Мабільны дадатак «Чароўны трусік»", дзе няма рэзка адмоўных вобразаў, а ёсць жывыя. У кожным суіснуюць супрацьлеглыя рысы, і ўсё залежыць ад выбару таго ці іншага персанажа. А каб герой не памыліўся, дапамогуць гледачы, "прымяраючы" на сябе адлюстраваныя сітуацыі. Дый Дзед Мароз паводзіць сябе, як мудры псіхолаг. Ніякай лухты, што гаджэты — зло: праграма для тэлефона здольная выканаць любое жаданне, толькі і незвычайнаму трусіку трэба дапамагчы, вывучыўшы інструкцыю. Самым маленькім прызначаная пастаноўка "З Новым годзікам!". Усе спектаклі — з арыгінальнай драматургічнай асновай, удзелам дзяцей. Кожны хлопчык і дзяўчынка маюць няхай маленечкую, але асобную ролю, з самаробнымі, папраўдзе выкшталцонымі касцюмамі. На адзін з паказаў патрапілі кітайскія студэнты, якія па заканчэнні адразу кінуліся ў закулісе пераймаць карнавальны вопыт і рабіць фота на памяць.

Ну а лялькі — дробныя і вялізныя — патрапілі ажно ў... оперу. Так-так, творчыя здабыткі тэатра лялек даўно прыйшліся даспадобы іншым відам і жанрам тэатральнага мастацтва. Сапраўды, як прымусіць дзіця паверыць у таго ж паўночнага аленя, што спявае басам? А менавіта такі герой ёсць, да прыкладу, у оперы расійскага кампазітара Сяргея Баневіча "Гісторыя Кая і Герды (Снежная каралева)", якую ўвасобіў наш **Вялікі тэатр**. Рэжысёр Ганна Маторная, мастакі Андрэй Меранкоў, Вольга Мельнік-Малахава і Таццяна Лісавенка прыдумалі столькі, што ахапіць увагай усе падзеі на сцэне можна хіба пасля некалькіх праглядаў: сваю траекторыю руху мае кожны задзейнічаны артыст, а іх — не злічыць. Бо, акрамя салістаў, хору, мімансца, сцэну шчыльна запаўняюць удзельнікі Дзіцячага музычнага тэатра-студыі, навучэнцы Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжа. Полістылёвасць музыкі, што выконваецца пад кіраўніцтвам дырыжора Юрыя Караваева, дазваляе кожнаму адшукаць свой меладычна-тэмбравы фрагмент.

Прыдзірлівы крытык знойдзе, вядома, некаторыя хібы, якіх можна было б пазбегнуць, але ці ж для гэтага прызначаны святы? Дарэчы, оперны тэатр з адмысловымі імпрэзамі не развітваецца: у ноч на стары Новы год там ладзіцца чарговы, ужо 14-ы па ліку Вялікі навагодні баль. Тэма сёлетняй падзеі — "Чароўныя казкі".

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

"Новая зямля"

Каларытныя вобразы з яркім характарам

Заслужанаму артысту Рэспублікі Беларусь Івану Пракопавічу Герасевічу 1 студзеня споўнілася 80 гадоў. Ён сыграў сотні роляў і да гэтага часу выходзіць на сцэну Брэсцкага тэатра лялек — задзейнічаны ў многіх спектаклях. Адкуль бяруцца сілы і натхненне? Адказы — у інтэрв'ю з юбілярам.

Іван Герасевіч прыйшоў у тэатр у 1965-м, а да гэтага працаваў... трактарыстам.

— Дакладней прычэпшчыкам, — распавядае Іван Пракопавіч. — Быў у саўгасе трактарыстам-камбайнерам, потым вырашыў перабрацца ў горад. У тыя часы многія з'язджалі з вёсак. Уладкаваўся ў Брэсце на камбінаце добраўпарадкавання горада.

— А як вы трапілі ў тэатр?

— Іду неяк па вуліцы Леніна і раптам бачу на плоце, а платы тады былі драўляныя, каля драмтэатра вісіць вялікая аб'ява: "Лялечнай групе пры Брэсцкім драмтэатры патрабуюцца акцёры-лялькаводы. Жадаючым звяртацца да Сярогіна". Ну, думаю, паспрабую. Быў абедзенны перапынак, я працаваў недалёка — на вуліцы Леванеўскага стаяў мой трактар. Заходжу ў тэатр, шукаю Сярогіна, знайшоў, кажу: "Такая справа, прачытаў аб'яву". "Добра, — адказвае ён, — рыхтуйце верш, байку, прозу. Як будзеце гатовы, завітвайце, я тут кожны дзень з 11-й гадзіны". Я падрыхтаваўся, прыходжу, чытаю верш, байку, прозу. Сярогін яшчэ пару эцюдаў задаў — паглядзеў, паслухаў, кажа: "Мы вас бяром, разлічвайцеся з папярэдняй працай".

Я вяртаюся да свайго начальніка, тады гэта быў Нячаеў, не памятаю, праўда, яго імя. Ну і распавядаю, так, маўляў, і так. "Добра, — адказвае, — у мяне якраз ёсць знаёмы ў Маскве ў Абразцова". "Я ў Брэсцкі тэатр збіраюся", — кажу. "Пішы заяву, мы цябе хутка аформім".

І сапраўды, праз тыдзень адпусцілі, нават не давялося адпрацоўваць. І першага жніўня 1965-га я адправіўся на новае працоўнае месца.

— І вось вы ў тэатры. Якія першыя ўражанні?

— Складана было. Я ж ніколі не выступаў з лялькамі. А бачыў, як гэта робіцца, толькі адзін раз — калі да нас у вёску прыязджаў мінскі тэатр. Я тады нават і не думаў, што сам апынуся на месцы артыста. І калі ўпершыню ўзяў у рукі ляльку, адразу пачалося замяшанне. Мне вельмі дапамагаў рэжысёр, вучылі акцёры, якія ўжо мелі досвед, — Генадзь Байкоў і яго жонка. Паказвалі рухі, як лялька працуе, ну і паволі справа пайшла, я ўсё засвоіў.

— Якія якасці неабходна мець, каб стаць акцёрам?

— Для гэтай прафесіі трэба нарадзіцца. Не кожны чалавек можа быць артыстам. І хоць у жыцці ўсе акцёры, працаваць на сцэне не ўсім дадзена.

— А калі з'явілася пачуццё, што тэатр — ваша пакліканне?

— Менавіта тады, калі ўбачыў аб'яву на драўляным плоце. Прачытаў і падумаў: "Гэта мае!" Хоць да той пары ніколі пра падобнае не марыў.

— Вы лічылі, колькі з таго часу сыгралі роляў і спектакляў?

— Велізарную колькасць! У лялечным тэатры акцёр можа выконваць не адну, а нават тры-чатыры ролі ў адной пастаноўцы. Калі ўсё падсумаваць, то за маё паўстагоддзе, а мы кожны год мінімум два спектаклі выпускалі, то атрымліваецца... Цяжка падлічыць дакладна.

— Вы шмат дзе пабывалі. Які тэатр лялек больш за ўсё ўразіў?

— Так, я бачыў працу розных калектываў, цікавыя пастаноўкі. Запомніўся тэатр Абразцова — мы спецыяльна ездзілі да іх у Маскву, нас пасылалі ў камандзіроўку.

— А ў чым асаблівасць Брэсцкага тэатра лялек?

— У тым, у чым і любога, — у кіраўніцтве, а менавіта ў рэжысуры. Калі ёсць годны рэжысёр, то тэатр адбыўся — і гледачы яго любяць і ходзяць на спектаклі.

— Што пажадаеце акцёрам-пачаткоўцам і моладзі, якая плануе звязаць жыццё са сцэнай?

— Галоўнае не зазнавацца, каб не было зорнай хваробы. Таксама ведайце, што поспех — гэта праца, праца і яшчэ раз праца. І канешне, зычу ўсім здароўя!

— Дзякуй, Іван Пракопавіч. І вам — здароўя, шчасця, доўгіх гадоў жыцця! І, калі ласка, працягвайце радаваць гледачоў вашымі творчымі поспехамі на сцэне.

Уладзімір БАБКОЎ,
загадчык літаратурнай часткі Брэсцкага тэатра лялек

"Прыгоды барона Мюнхгаўзена"

"Фро"

Іван Пракопавіч ГЕРАСЕВІЧ

(нар. 01.01.1943 г., в. Стрыганец Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.), скончыў Беларускую акадэмію мастацтваў (1992). З 1965 — артыст лялечнай трупы пры Брэсцкім драмтэатры імя ЛКСМБ, з 1968 — артыст Брэсцкага тэатра лялек. Віртуозна валодае лялькамі разнастайных сістэм. Яго героі заўсёды надзелены яркімі характарамі. Найбольш значныя ролі: Іван ("Іван — сялянскі сын" В. Сударушкіна), Леў ("Гадзіннік з зязюляй" А. Пракофевай), Воўк ("Чырвоная Шапачка" С. Когана і С. Яфрэмава), ганчар Хабіба ("Таршчочак — гаварун" А. Абу-Бакара), Султан ("Чароўная лямпа Аладзіна" Н.Гернет), Барон Мюнхгаўзен ("Прыгоды барона Мюнхгаўзена" А. Браўсевіча), ролі ў спектаклях "Халстамер" паводле Л. Талстога, "Новая Зямля" паводле Я. Коласа, "Фро" паводле А. Платонава, "Самазванец" па А. Пушкіне і інш. Стварыў каларытныя вобразы ў пастаноўках па п'есах беларускіх аўтараў: Дзед ("Рыгорка — ясная Зорка" А. Вярцінскага), Поп і Пан ("Дзед і Жораў" В. Вольскага), Князь Юрый ("Балада аб белай вішні" С. Клімковіч). Здымаўся ў кіно ("Дачка камандзіра", "Бітва за Маскву", "Цяжка быць Богам", "Сведка", "Тэст для маладых" і інш.). Лаўрэат грамадскай прэміі "Брэсцкія зоркі — 2003", узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь (2014).

Пачатак новага года — час будаваць планы. А каб яны ажыццявіліся, не залішне падсумаваць тое, што зроблена ў 2022-м. Бо толькі абапіраючыся на мінулае, можна ствараць будучыню. Ці не гэтаму нас вучыў Год гістарычнай памяці?

Удзельнікі талакі ў Радагошчы — мясцовыя жыхары

Здзейсненае застанецца!

Суботнік у Радкоўшчыне

Пленэр у Сёмкаве

"К"ЎЛЬТУРНЫ АДПАЧЫНАК, АБО "СУБОТНІКІ З «К»"

Скажам не сароме-ючыся: для нас папярэдні год аказаўся надзвычай плённы, багаты на гістарычныя адкрыцці і нават на невялічкія сенсацыі. Было ў ім шмат падзей, якія спадабаліся аматарам актыўнага культурнага адпачынку. Згадаем шматлікія суботнікі ў гістарычных мясцінах, якія прайшлі з натхненнем і пры непасрэдным удзеле журналістаў "К".

Да Бохвіцаў у Дарава, да Рэйтанаў у Ляхавічы. Адзін з першых вясновых выездаў меў двайную мэту. Спярша адбылася талака на могілках у Дараве (Баранавіччына), дзе разам з сям'ёй вечным сном спачывае беларускі філосаф XIX стагоддзя Фларыян Бохвіц. Потым мы адправіліся ў суседні раён. Там, на ляхавіцкіх гарадскіх могілках, з 1796 года аддавалі зямлі прадстаўнікоў роду Рэйтанаў ды, магчыма, быў перапахаваны і самы знакаміты з гэтых шляхцічаў — Тадэвуш.

Да Манюшкаў у Радкоўшчыну (Смаляўцкі раён). Вёска і маёнтак Манюшкаў былі знішчаны ў 1944 годзе. І пра тое, што на пагорку пад старой лістоўніцай калісьці стаяла прыгожая драўляная сядзібка, сёння ведаюць нямногія. А вось у XIX стагоддзі назва Радкоўшчыны грымела далёка за межамі Беларусі. На сельскіх могілках засталіся падмуркі капліцы, у якой пахаваныя бацькі кампазітара Станіслава Манюшкі. І, падаецца, адзіныя, каму ёсць да гэтага месца справа, — супрацоўнікі "Культуры" (гл. "К" № 20, 2022).

Да Дамейкі ў Мядзвядку (Карэліцкі раён). Сядзіба, дзе нарадзіўся вядомы беларус Ігнат Дамейка, геолаг, этнограф і асветнік, даўно магла б стаць візітоўкай раёна. Вядома, калі б нарэшце было прынята рашэнне на руінах спаленага ў часы Першай сусветнай вайны маёнтка аднавіць сціплы палацык. У дзень рэспубліканскай акцыі "Пасадзі дрэва" падмуркі дома былі расчышчаны ад кустоўя, таксама ў Мядзвядку з'явіўся дубок Ігната Дамейкі і яшчэ некалькі дрэўцаў у гонар найбліжэйшых сяброў навукоўцы з філамацкага кола (гл. "К" № 18, 2022).

У Радагошчу да Адама Міцкевіча. Радагошча — гэта і вёска, і старажытнае гарадзішча ў самым сэрцы Навагрудскага раёна. На сельскіх могілках засталіся падмуркі капліцы, у якой пахаваныя бацькі кампазітара Станіслава Манюшкі. І, падаецца, адзіныя, каму ёсць да гэтага месца справа, — супрацоўнікі "Культуры" (гл. "К" № 20, 2022).

Да Дамейкі ў Мядзвядку (Карэліцкі раён). Сядзіба, дзе нарадзіўся вядомы беларус Ігнат Дамейка, геолаг, этнограф і асветнік, даўно магла б стаць візітоўкай раёна. Вядома, калі б нарэшце было прынята рашэнне на руінах спаленага ў часы Першай сусветнай вайны маёнтка аднавіць сціплы палацык. У дзень рэспубліканскай акцыі "Пасадзі дрэва" падмуркі дома былі расчышчаны ад кустоўя, таксама ў Мядзвядку з'явіўся дубок Ігната Дамейкі і яшчэ некалькі дрэўцаў у гонар найбліжэйшых сяброў навукоўцы з філамацкага кола (гл. "К" № 18, 2022).

У Радагошчу да Адама Міцкевіча. Радагошча — гэта і вёска, і старажытнае гарадзішча ў самым сэрцы Навагрудскага раёна. Ад мястэчка да Свіцязі рукой падаць. А яшчэ гэта маёнтак Чомбраў, спалены ў часы вайны. Звязаны ён не толькі з вядомым паэтам. Важную старонку ў летапіс Чомбрава дадалі і сваякі мастака Генрыка Семірадскага. Сёння гарадзішча шчыльна парасло кустоўем, а калісьці станавілася пляцоўкай для розных свят і нават для першага рэспубліканскага "Купалля". Нашу ініцыятыву аб правядзенні суботніка падтрымала кіраўніцтва Навагрудскага раёна. Талака адбылася, але патрэбен працяг. І вясной мы абавязкова вернемся ў Радагошчу (гл. "К" № 25, 2022).

У Сёмкава да Хмараў. Маёнтак апошняга мінскага ваяводы часоў Вялікага Княства Літоўскага Адама Хмары амаль пад самым бокам сталіцы, як кажуць, на слыху. Не першы год сядзібу даглядае мясцовая грамада, што прыбірае тэрыторыю, ладзіць культурныя мерапрыемствы і прыцягвае ўвагу людзей да таго сумнага стану, у якім апынулася колішняя магнацкая рэзідэнцыя. У Сёмкаве век назад працавалі нашы класікі Якуб Колас і Янка Купала — месца з гісторыяй! Але ў татальным занядбанні. Таму мы вырашылі далучыцца да ратавання не толькі друкаваным словам, але і справай. Спярша адбыўся суботнік, а за ім і Першы Пленэр у Сёмкаве. У імпрэзе, акрамя некалькіх мастакоў-аматараў, браў удзел прафесійны жывапісец Алесь Родзін. На вялікі жаль, для майстра пленэр стаў апошнім. Даўняга сябра "К" не стала 19 снежня 2022-га. І гэта страта незаменная... (Гл. "К" № 38, 2022.)

Агулам жа было праведзена 12 суботнікаў, якія ахапілі тры рэгіёны: Міншчыну, Гродзеншчыну і Брэсткую.

АПОШНІ РАЗВАРОТ — "ГІСТАРЫЁГРАФ"

Нашы сталыя чытачы ведаюць, што на апошніх старонках "К" можна знайсці эксклюзіўныя матэрыялы, прысвечаныя вядомым і забытым дзеячам культуры Беларусі. Часцяком тэксты багатыя на сенсацыі і прывабныя ідэі. Напрыклад, як гэта было ў артыкулах...

Генрых Семірадскі, або Час перапісаць гісторыю. Публікацыя пра сусветна вядомага мастака, продкі якога стагоддзямі жылі на Навагрудчыне і Міншчыне. І хоць сам ён нарадзіўся на ўкраінскай зямлі, дзе стаяў полк бацькі, сувязь з радзімай мастак не парываў. Мы разбурылі міф паходжання Семірадскіх з Польшчы (з сяла Семірадз). А заадно высветлілі, што іх прозвішча раней было Сяміградскія-Рамашкевічы. Семірадскімі шляхцічы сталі ў 1730—1740-х гадах (гл. "К" № 35, 2022).

Таямніцы Юзафа Казлоўскага. У артыкуле, прысвечаным славутаму кампазітару XVIII—XIX стагоддзяў, былі выпраўлены некаторыя памылкі ў жыццярысе творцы, а таксама прыведзена гіпотэза аб паходжанні з Клеччыны продкаў музыканта (гл. "К" № 38, 2022).

Асветнік і гуманіст з роду Манюшкаў. Як вядома, Дамінік Манюшка, дзядзька кампазітара, быў чалавекам перадавых поглядаў. Дэмабілізаваўшыся з войска і асеўшы ў Радкоўшчыне, Дамінік наважыўся на эксперымент, які на пачатку XIX стагоддзя выглядаў вар'яцтвам, — вызваленне сялян ад прыгону і адкрыццё для іх дзяцей школ (!). Эксперымент удаўся і меў гучны розгалас. На жаль, у наш час імя годнага чалавека амаль забытае, а на прыкасцельных могілках на Залатой Горцы, дзе Дамінік Манюшка быў пахаваны, няма ніякага памятнага знака і дагэтуль (гл. "К" № 39, 2022).

Вялікая перэгрынацыя Парацэльса. Імя сярэднявечнага лекара, які здзейсніў рэвалюцыю ў галіне медыцыны, у нас сёння малавядомае. Але пры належным падыходзе турыстычны маршрут "Шлях Парацэльса" мог бы стаць вельмі запатрабаваным. Справа ў тым, што на пачатку 1520-х Парацэльс у пошуках новых ведаў завітаў у Вялікае Княства Літоўскае, у Вільні паспеў паўдзельнічаць у дыспутах з Францішкам Скарынам (і быў пераможаны), а потым адправіўся далей на ўсход, у Смаленск. Дарога лекара туды магла пралягаць праз гарады Паўночнай або Цэнтральнай Беларусі (гл. "К" № 45, 2022).

Ануфрый Петрашкевіч — руплівец нашай спадчыны. Гэтая публікацыя закрывае шматлікія белыя плямы ў жыцці паэта і архівіста з таварыства філаматаў. Творца, дарэчы, нарадзіўся на Баранавіччыне, а не на Шчучыншчыне, як сцвярджалі некаторыя. Дзякуючы намаганням Ануфрыя, а потым і высілкам яго сваякоў, быў захаваны неверагодна багаты архіў, дзе, акрамя вершаў і лістоў, знаходзілася ўся дакументацыя (пратаколы пасяджэнняў, маніфесты і г. д.) (гл. "К" № 42, 2022).

Таямніцы Багрымаў, або Па тонкім лёдзе загадак. У гэтым матэрыяле, зважаючы на новыя і старыя архіўныя крыніцы, мы распавялі пра лёс крошынскага каваля Паўла Багрыма, што лічыцца аўтарам аднаго з першых беларускамоўных вершаў "Зайграй, зайграй хлопча малы...". А таксама падзяліліся гіпотэзай пра паходжанне Багрымаў, паводле якой у Крошын прадстаўнікі роду прыйшлі каля 1812 года з Новай Мышы і раней іх прозвішча пісалася "Бутрым" (гл. "К", № 47, 2022).

Паштовы раман Анарэ дэ Бальзака, або ШТО яднае французскага пісьменніка з Беларуссю. Імя славутага літаратара ў нашай краіне на слыху, а вось пра тое, што палову жыцця творца дабіваўся рукі ўнучкі Тадэвуша Рэйтана Эвеліны Ганскай (і дасягнуў мэты) ды ледзь не стаў мужам дваюраднай сястры Станіслава Манюшкі, ведаюць адзінкі. Сярод абазнаных — нашы чытачы! (Гл. "К" № 50, 2022.)

Войт асады альбанскай, або У Беларусь вярнулася страчаная опера Мацея Радзівіла. Заваяўшае спіс публікацыя, якая раскрыла таямніцы оперы Мацея Радзівіла, пастаўленай у Нясвіжы на імянінах Пане Каханку ў 1785 годзе. Прычым ролі выканалі Радзівілы і сваякі роду (гл. "К" № 51, 2022).

Працяг будзе не менш цікавы!

Зміцер ЮРКЕВІЧ

Будзем разам, і птушка-абярэг прыляціць да вас!

Шчэпавая птушка выкарыстоўвалася для абароны дзяцей і ўсёй хаты ад злых сіл. Лічылася сімвалам сямейнага шчасця. Распрастаныя крылы і хвост утвараюць кола, нагадваючы сонца. Абярэг аздабляе разьбяны ўзор — традыцыйныя беларускія ромбікі. Тэхналогія вырабу шчэпавай птушкі занесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь у 2016 годзе.

Наша газета працягвае цешыць чытачоў прыемнымі сюрпрызамі. Сёння прапануем новую крыжаванку, разгадаць якую можна, перагартаўшы падшыўку снежаньскай "Культуры". Чакаем вашы адказы на e-mail **reklama@kultura-info.by** да 4 лютага. Хто першым дашле правільнае рашэнне, атрымае ўзнагароду — шчэпавую птушку-абярэг!

Цімафей КАРПІНЧЫК

Па гарызанталі:

2. Дырэктар Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.
3. Першы намеснік генеральнага дырэктара сеткі кінатэатраў "КіноМінска".
4. Назва першага раённага конкурсу сярод працоўнай моладзі, што зладзілі ў Цэнтры культуры Хоцімска Магілёўскай вобласці.
8. Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, якая летась адзначыла 30-годдзе сцэнічнай дзейнасці.
9. Элемент, уключаны ў Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны UNESCO ў снежні 2022 года.
11. Савецкі жывапісец, графік, педагог, народны мастак СССР.
13. Горад, дзе плануецца стварыць музей галаграфіі.
16. Від спорту, якім займаўся мастак, жывапісец ды ілюстратар беларускага паходжання Георгій Ніскі.
17. Вусная народная творчасць.
18. Песня-візітоўка ансамбля "Верасы".
19. Установа ў Парэччы на Піншчыне, заснаваная Аляксандрам Скірмунтам, на малюнку Напалеона Орды.
21. Намінацыя XIX Міжнароднага дзіцячага конкурсу "Музыка надзеі".
23. Хрысціянскае свята, якое ў народзе называюць Грамніцы.
26. Кіно па-іншаму.
28. Краіна-ўдзельніца XII Мінскага міжнароднага Каляднага опернага форуму.
29. Міні-серыял (Францыя, 1999), у якім галоўную ролю выканаў вядомы акцёр Жэрар Дэпардзьё.
33. Месца, дзе ў Бярозе жылі картузіянцы.
34. Дзіцячы клуб выхаднога дня Дужаўскага сельскага Дома народнай творчасці Чавускага раёна, што на Магілёўшчыне.
38. Спектакль, прэм'ера якога адбылася 17 снежня ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі.
40. Карціна Мікалая Бандарчука, члена Беларускага саюза мастакоў, выкладчыка Гродзенскага каледжа мастацтваў.
41. Назва пастаноўкі аб праблеме дамінавання ў грамадстве ў выкананні харэаграфічнага ансамбля "Алеся".
42. Сталічны кінатэатр.
44. Народны гурт Слабодскага СДК, што ў Клічаўскім раёне.

Па вертыкалі:

1. У пераносным значэнні — мерапрыемства, якое праходзіць працяглы час і ахоплівае шмат падзей. Першапачаткова — бег на доўгую дыстанцыю.
2. Бывае міжкультурным. Размова паміж дзвюма ці больш асобамі.
5. Праект Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея на V Нацыянальным форуме "Музеі Беларусі" ў намінацыі "За навацыі ў музейнай дзейнасці".
6. Беларускі дзяржаўны ансамбль народнай музыкі.
7. Старажытнае земляробчае свята, на якое шукаюць папараць-кветку.
10. Літаратурны рэдактар газеты "Культура".
11. Раман ураджэнца Бабруйска Эфраіма Севелы.
12. Народны вакальны ансамбль з Хоцімскага раёна, прызёр III Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу выканаўцаў патрыятычнай песні, што прайшоў у лістападзе ў Оршы.
14. Санаторый — кліматычная здраўніца курортнай зоны Гомельскага раёна.
15. Рэквіем у адной дзеі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.
20. Народны мастак Беларусі, прафесар, які ў снежні адзначыў творчы юбілей — 60 гадоў працы ў Купалаўскім тэатры.
22. Яшчэ адна прафесія этнографа, выкладчыка Глеба Бонч-Асмалоўскага.
24. Загадчык музея Янкі Купалы ў Расіі.
25. Беларускі гатэль, праект якога быў распрацаваны ў 1968 годзе.
27. Драматург, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, старшыня Беларускага саюза тэатральных дзеячаў.
29. Чытачка "К", якая першай разгадала крыжаванку ў снежні 2022 года.
30. Фестываль фальклорнага мастацтва, які ладзіцца ў краіне з 1998 года.
31. Узоры ансамбль фальклорнага танца Ліпніцкага СДК, што ў Драгічынскім раёне на Брэстчыне.
32. Назва канцэрта, які правялі 11 снежня ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета.
35. Прафесія Алеся Родзіна, які пайшоў з жыцця 19 снежня 2022 года.
36. Фальклорны ансамбль з Казахстана.
37. Культурная сталіца Беларусі ў 2023-м.
39. Назва праграмы, якая адбылася ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы.
41. Карціна Мікалая Бандарчука, члена Беларускага саюза мастакоў, выкладчыка Гродзенскага каледжа мастацтваў.
43. Назва адной з частак канцэрта для трубы з аркестрам "Пад прытулкам Усявышняга" Аліны Безенсон.
45. Аблічча ўсяго спектакля.
46. Студыя цыркавога мастацтва ў Мазыры.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7.
Тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627
Пошта: kupalabilet@mail.ru

• Прадстаўленне **"Музыка душы" (0+).** Камінная зала. **8, 13 студзеня а 19.00.**
• Рэквіем у 1 дзеі **"Вечар" (12+).** Галоўная сцэна. **10 студзеня а 16.00.**
• Трагікамедыя **"Апошні атракцыён" (16+).** Прэм'ера. Галоўная сцэна. **11 студзеня а 19.00.**
• Звычайная гісторыя **"Час жыцця" (12+).** Галоўная сцэна. **12 студзеня а 19.00.**
• Траіфарс **"Donna sola (Жанчына адна)" (18+).** Камерная сцэна. **13 студзеня а 19.00.**
• Надзвычайна неверагоднае здарэнне ў 2 дзеях **"Жаніцьба" (12+).** Галоўная сцэна. **14 студзеня а 19.00.**

УНП 100377901

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 8 017 3970163
(экскурсійнае бюро)

• **Пастаянныя экспазіцыі.**
• Выстава Аляксандра Карпана, прысвечаная 70-годдзю з дня нараджэння майстра. **Да 15 студзеня.**
• Выстава **"А. Я. Архіпаў і майстры Саюза рускіх мастакоў"**, прымеркаваная да 160-годдзя з дня нараджэння выдатнага жывапісца А. Я. Архіпава і 120-годдзя з даты заснавання Саюза рускіх мастакоў. **Да 22 студзеня.**
• Выставачны праект **"Жаночы род". Да 8 студзеня.**
• Персанальная выстава Валянціны Шоба **"Калядныя карункі". Да 23 студзеня.**
• Выстава **"Віктар Грамыка. Абняць неабдымнае"**, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння мастака. **Да 22 студзеня.**
• Выстава Тамары і Уладзіміра Васюкоў **"Творцы"**. **Да 12 лютага.**
• Заняткі курса **"Філасофія з дзецьмі ў Мастацкім"** (наведвальнікі ад 7 да 10 гадоў). **Да 9 сакавіка.**
• Экскурсіі: **"Якога колеру зіма?" (6+), "Казкі Усходу" (10+), "Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма" (10+), "Пяць моў кахання" (10+).** Праводзяцца заўсёды.

УНП 100377771

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1.
Тэл.: 8 017 2431041 (каса),
8 017 3615493

• Канцэрт **"Казкі Венскага лесу" (12+). 8 студзеня а 19.00.**
• Канцэрт **"Музыка Галівуда. Джон Уільямс" (12+). 10—11 студзеня а 19.00.**
• **Вялікі навагодні баль (12+). 13 студзеня а 19.30.**
• Балет у 2 дзеях **"Бахчысарайскі фантан" (12+). 14 студзеня а 18.00.**
• Канцэрт **"Калядная зорка" (6+). 14 студзеня а 18.30.**

УНП 191081322

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл. 8 017 2030792, 8 029 1440792,
8 017 3271166

• **Пастаянная экспазіцыя**.
• Выстава **"Вызваленне Еўропы"** ў рамках міжнароднага праекта **"Тэрыторыя Перамогі"**, які аб'ядноўвае 250 музеяў і ваенна-гістарычных цэнтраў Расіі і іншых замежных краін.
• Анлайн-выстава **"Трагедыя народаў".**

УНП 100235472

МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37.
Тэл.: 8 0222 650203, 8 0222 658800

• **Пастаянныя экспазіцыі**.
• Выстава **"Працяг сямейных традыцый. Марыя Васільеўна Ляпіна-Паленава"** з фондаў Дзяржаўнага мемарыяльнага гісторыка-мастацкага і прыроднага музея-запаведніка В. Д. Паленава. **Да 22 студзеня.**
• Выстава **"В. К. Бялыніцкі-Біруля і мастакі з яго кола"**, прысвечаная 150-годдзю з дня нараджэння жывапісца. **Да 26 лютага.**
• Art-lectorium **"Зразумелае мастацтва". Праводзіцца заўсёды.**
Падрабязней на сайце artmuseum.by альбо па тэлефонах 8 0222 650203, 8 0222 658800.

УНП 100377771

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
+375 29 5518051, +375 29 1903149

Палацавы ансамбль
• Дзіцячая творчая пляцоўка **"Калядная майстэрня"** з фотазонай і магчымасцю зрабіць здымак у гістарычным касцюме. Тэатральная зала. **7 студзеня.**
• Калядная экскурсійная праграма **"Навагоднія хронікі старога замка". 7—8 студзеня.**
• Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара"**. У складзе пастаяннай экспазіцыі.
• Выстава прац удзельнікаў міжнароднага конкурсу па вырабе навагодняй цацкі ў тэхніцы ірландскіх карунак **"Звяжам свет прыгажосцю"**. Белая бальная зала. **Да 22 студзеня.**
• Экспазіцыя ёлачных цацак **"У Новы год прыходзіць казка...".** Малая выставачная зала. **Да 22 студзеня.**
• Часовая экспазіцыя **"GLORIA ARME: ваенна-гістарычная рэканструкцыя даспехаў і зброі".** Вялікая выставачная зала. **Да 10 студзеня.**
• Выставачны праект **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны"**, прысвечаны Году гістарычнай памяці. У экспазіцыйнай зале першага пускавога комплексу. **Да 15 студзеня.**

Мерапрыемствы
• Квэсты: **"Палацавыя таямніцы", "Музычная скарбніца Нясвіжскага палаца".**
• Віртуальныя выставы: **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны", "Нясвіж — здабытак сусветнай культуры"**, экспазіцыя Паўла Татарнікава **"Магнацкія двары і замкі Беларусі".**
• Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках г. Нясвіжа.

Аддзел экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці (г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1)
• Персанальная выстава мастачкі Юліі Мардванюк **"Яркія штрыхі тэкстылю". Да 15 лютага.**

Ратуша (г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3)
Пастаянныя экспазіцыі
• **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII — 1-й палове XIX стст.".**
• **"Нясвіж у міжваенны час. Людзі і падзеі".**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX—XX стст. **"Культура часу"**. З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы
• Лялечны спектакль **"Навагоднія прыгоды Данькі"** (група да 20 чалавек). **З 12 снежня.**
• Квэсты: **"Безаблічны артэфакт", "Карта сямі каралеўстваў", "Музейны дэтэктыў", "Музейнае расследаванне".**
• Культурныя мерапрыемствы: **"Прыём у княгіні", "Дзень нараджэння ў Ратушы"** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **"Школа шпіёнаў".** Група да 25 чалавек.
• Гульня-знаёмства **"Музейка аб музеі"** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **"Выкрунтасы"** (група да 25 чалавек).

Падрабязнасці па тэлефонах 8 01770 20602, 8 01770 20660 або на сайце niasvizh.by.

УНП 600207920

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а.
Тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Выстава мастака-ілюстратара Паўла Татарнікава **"Дакрануцца да мінулага". Да 10 студзеня.**
• Экскурсія **"Шлях мастака Валенція Ваньковіча"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
• Экскурсія **"Сядзібны партрэт"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
• Спектакль тэатра ценяў **"Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. Белая сарока"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47.
Тэл.: 8 017 4247814
Час працы: аўторак — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Выставачны праект **"Сусветны поп-арт: ад Уорхала да Бэнксі" (12+). Да 22 студзеня.**

г. Мінск, вул. Някрасава, 3. Тэл.: 8 017 3990978
• Выставачны праект **"Чакайце нас, зоркі!". Да 29 студзеня.**

УНП 192543414

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г. п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Выстава **"МІРная зброя".** Калекцыя халоднай зброі, вайсковага рыштунку і ўзнагарод з фондаў музея. **Да 8 студзеня.**
• **Калядны баль для дарослых. 14 студзеня а 19.00.**
• Экспазіцыя **"ARMATUS (0+). Ваенна-гістарычная рэканструкцыя даспехаў і зброі".** Паўночны корпус. **Да 31 жніўня.**
• **Дзіцячы калядны баль (6+). 7 студзеня а 12.00 і 15.00.** Для дам і кавалераў ад 6 да 12 гадоў.
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **"Інтрыгі Купідона".**
• Сямейная квэст-экскурсія **"Легенды і паданні Мірскага замка".**
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце", "Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст.", "Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст.", "Печы з каробкавай кафлі XVI—XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў".**

УНП 590201541

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, д. 2.
Тэл.: 8 0212 669077 (каса)

• Навагодні спектакль у 1 дзеі **"Зімовая казка"** і танцавальна-забаўляльная праграма **"Распакоўка цудаў" (3+). 8 студзеня аб 11.00, 14.00; 14 студзеня аб 11.00.**

УНП 300001869

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён.
Тэл.: 8 017 5074468

• **Пастаянная экспазіцыя**.
• Праграма **"Каляды ў музеі". Праводзіцца заўсёды.** Працягласць — 2—2,5 гадзіны. Папярэдні запіс абавязковы.

УНП 100377771



Наш стыкерпак папоўніўся яшчэ адным героем. Сустракайце ў Telegram-канале @kultinfa: Уладзімір Караткевіч!

Творы літаратара перакладзеныя на многія мовы свету, у тым ліку на англійскую, балгарскую, венгерскую, в'етнамскую, грузінскую, іспанскую, латышскую, нямецкую, мангольскую, польскую, рускую, славацкую, украінскую, французскую, чувашскую,чэшскую, эстонскую.

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Тэлефоны: **8 017 3970163, +375 25 6677819.**

З пытаннямі размяшчэння рэкламы звяртайцеся па тэлефоне **8 017 2860797** або на электронную пошту **reklama@kultura-info.by.**

Пераможца 2006 г.
Гран-пры 2010 г.
Пераможца 2022 г.

КУЛЬТУРА

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)

Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — ДУЛЕВІЧ Віктар Іванавіч.

Першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.

Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.

Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.

Рэдактар аддзела — Яўген РАГІН.

Аглядальнікі рэдакцыі: Надзея БУНЦЭВІЧ, Антон РУДАК, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ, Данііл ШЭЙКА, Зміцер ЮРКЕВІЧ, Настасся ЮРКЕВІЧ.

Літаратурны рэдактар — Мацвей ЗАЙЦАЎ.

Мастацкі рэдактар — Марына ПЯРКОЎСКАЯ.

Прыёмная: 8 017 3345741. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх.

Бухгалтэрыя: 8 017 3345735.

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.

Тэлефоны: 8 017 2860797, 8 017 3345723.

Тэлефон-факс: 8 017 3345741.

Рэкламны аддзел: тэл.: 8 017 2860797.

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

*Матэрыял на правах рэкламы. ©"Культура", 2023.

Наклад 3238.
Індэксы 63875, 638752, 63879, 63872, 638722.
Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 05.01.2023 а 18.00. Замова № 145.
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

Сайт: www.kultura-info.by
e-mail: kim@kultura-info.by